ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок ценп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -надбаўкі.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СУБОТА, 21 чэрвеня 1930 г.
№ 143 (3741)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

РЭЗАЛЮЦЫЯ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

па дакладах т.т. Гея і Васілевіча аб рабоце ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы справаздачу аб рабоце ЦК КП(б)Б, XIII зьезд прызнае палітычную лінію ЦК КП(б)Б правільнай, цапкам адпавядаючай генэральнай лініі УсеКП(б) і поўнасьцю ўхваляе арганізацыйную дзейнасьць і практычную работу ЦК КП(б)Б.

За пэрыяд часу паміж XII і XIII зьездамі КП(б)Б партыя, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б з посьпехам змагалася супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнчых адносін да ўсіх відаў апартунізму, разграміўшы: рашткі контр-рэвалюцыйнага трацкізму. КП(б)Б нанесла рашучы ўдар найбольш яскраваму праяўленьню правага ўхілу ў КП(б)Б — прышчэпаўшчыне, якая стаяла стаўку на капіталістычнае разьвіцьцё вёскі і ўзмацненьне кулака і сыстэматычна зрывала мерапрыемствы партыі па сацыяльнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У бязьлітасным барацьбе з усякага роду хіткасьнямі і ўхіламі ад ленінскай лініі, Цэнтральнаму Камітэту за справаздачны час удалося дасягнуць яшчэ большай ідэйнай загартаванасьці і павышэньня ідэалёгічнага ўзроўню ўсёй партыйнай арганізацыі.

Пасьлядоўнаажыцьцяўляючы нацыянальную палітыку, партыя вяла рашучую барацьбу з контр - рэвалюцыйным зацыянал - дэмакратызмам, які выступаў адзіным фронтам з нацыянал-фашызмам Заходняй Беларусі, даючы ў той жа час моцны адпор правым шавінізму розных масьцей. Партыя пасьпяхова змагалася з усялякімі ўхіламі і хісткасьнямі ў галіне нацыянальнага пытаньня ў радах партыі (нацыянал-апартунізм і прымірэнчыя адносіны да яго), выкрываючы і падвяргаючы жорсткай крытыцы права - апартуністычныя і нацыянал - апартуністычныя погляды і ўстаноўкі т. т. Жылуновіча, Чарвякова, Бэйліка і інш.

У галіне прамысловасьці КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК дасягнула буйных посьпехаў. Рост валавой прадукцыі прамысловасьці БССР ідзе выключна шпаркім тэмпам (прырост на 72 проц. у першым паўгодзьдзі 1929-1930 г. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем 1928-1929 г.), пасьпяхова выконваецца праграма капітальнага будаўніцтва, якая забясьпечвае выкананьне пяцігодкі па прамысловасьці ў чатыры гады. Значныя посьпехі дасягнуты ў галіне электрыфікацыі. Шпарка павялічваецца агульная колькасьць рабочых, занятых на прадпрыемствах БССР; расьце і ўзмацняецца пралетарская база, што яшчэ больш забясьпечвае ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту і далейшыя посьпехі партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі выклікала нябывалы ўздым актыўнасьці рабочае клясы, які атрымаў выраз у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, як штодзённага мэтаду работы на прадпрыемствах, у прыцёку ў рады партыі лепшых, найбольш актыўных, найбольш адданых рабочых. Уздым актыўнасьці рабочае клясы знайшоў сваё выражэньне і ў далейшым шырокім разгортваньні пралетарскай самакрытыкі.

Партыя дабілася значных дасягненьняў і ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Колькасьць калгасаў да моманту XIII зьезду дасягнула да 12 проц. ахопу ўсіх двароў (замест 1 проц. да моманту XII зьезду) і да 15,7 проц. пасеўнай плошчы БССР. Вызначыўся некаторы зрух у бок папяпшэньня работы і пашырэньня савецкіх гаспадарак.

У справе калектывізацыі радам арганізацый КП(б)Б былі дапушчаны перагібы і скажэньні партыйнай лініі. У аснове памылак, перагібаў і скажэньняў лініі партыі ў вёсцы пяжалі няправільныя адносіны да серадняка. Быў дапушчан прымус у галіне гаспадарчых узаемаадносін з серадняком, быў парушан ленінскі прынцып добраахвотнасьці пры пабудове калгасаў. «Гэтыя памылкі маюць тэндэнцыю сьпіхнуць нас са шляху ўзмацненьня саюзу з асноўнымі масамі сялянства, са шляху ўзмацненьня пралетарскай дыктатуры на шлях разрыву з гэтымі масамі, на шлях падрыву пралетарскай дыктатуры». (Сталін).

Побач з мясцовымі партыйнымі арганізацыямі, рад асобных памылак у справе калектывізацыі быў дапушчан і Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б. Зьезд цапкам і поўнасьцю ўхваляе пастанову бюро ЦК ад 17 красавіка, у якой з бальшавіцкай простасьцю і яснасьцю прызнаюцца асобныя памылкі Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б у кіраўніцтве калгасным рухам. Зьезд цапкам і поўнасьцю ўхваляе ўсе мерапрыемствы ЦК, накіраваныя на выпраўленьне памылак, перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі з боку мясцовых партыйных арганізацый (Шклоў, Ворша і інш.). Аднак, зьезд адзначае, што і да гэтае пары нагляднаюцца асобныя выпадкі недастатковага-рашучага выпраўленьня памылак, выпадкі ўпартасьці і замаскаваньня няўхільнасьці памылак. Рашучае выпраўленьне памылак і скажэньняў партыйнай лініі ў справе калектывізацыі стварыла ўмовы для далейшага разгортваньня калгаснага руху на падставе ленінскіх прынцыпаў добраахвотнасьці і дазволіла партыі пасьпяхова кіраваць ходам веснавой пасеўнай кампаніі.

Посьпехі партыі ў галіне калектывізацыі забясьпечылі пераход ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня кулацтва да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы, на падставе суцэльнай калектывізацыі. Гэтыя посьпехі стварылі перасўку ў суадносінах клясавых сіл у вёсцы, паспабіўшы эканамічную пазыцыю кулацтва, яшчэ не разгромленага і працягваючага шалёнае супраціўленьне мерапрыемствам партыі і савецкай улады, і стварылі новую апору савецкай улады і партыі ў асобе калгаснікаў. Рост супраціўленьня клясавага ворага разьвіцьцю сацыялістычнага будаўніцтва будзе выклікаць далейшае абастрэньне клясавай барацьбы ў нашай краіне. Далейшае разгортваньне калгаснага будаўніцтва на падставах добраахвотнасьці, дапамога і садзейства гаспадарчаму ўзмацненьню калгасаў зьяўляюцца першачарговымі задачамі партыйных арганізацый, зьезд рашуча асуджае лінію правых апартуністых на адмаўленьне ад далейшага разгортваньня калгаснага будаўніцтва і кіраўніцтва ім, на прадастаўленьне калгаснага будаўніцтва самацёку. Пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач партыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуе ў некалгасным сэктары далейшага ўзмацненьня работы з беднатой і ажыцьцяўленьня палітыкі саюзу з серадняком.

Пасьлядоўна праводзячы ленінскія прынцыпы ў нацыянальнай палітыцы, партыя дабілася буйных посьпехаў ў справе культурнага будаўніцтва. Увядзеньне ўсеагульнага навучаньня, узмацненьне работы па ліквідацыі няпісьменнасьці, пашырэньне сеткі навучальных і навуковых устаноў, у тым ліку і вышэйшых, посьпехі ў справе беларусізацыі і рост тыражу газэт, кніг, часопісяй на беларускай мове і на мовах нацменшасьцяй—сьведчаць аб посьпехах партыі ў гэтай галіне.

Работа КП(б)Б у пэрыяд паміж XII і XIII зьездамі разгортвалася ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня ўнутры краіны, нарастаньня рэвалюцыйнай барацьбы рабочае клясы і працоўных мас у капіталістычных і калёніяльных краінах. У гэты пэрыяд узрасла небясьпека ваеннага нападу імпэрыялістычных дзяржаў на Савецкі Саюз.

Зьезд ухваляе ўсе мерапрыемствы ЦК, накіраваныя на ўзмацненьне абароназдольнасьці і на пераўтварэньне БССР у сапраўды моцны фарпост на рубяжох з капіталістычным Захадам.

У далейшай рабоце зьезд прапануе Цэнтральнаму Камітэту кіравацца наступным:

1. У цэнтры ўвагі ўсёй партыйнай арганізацыі па-ранейшаму павінна стаяць барацьба з правай небясьпекай, як галоўнай на даным этапе, а таксама з «левымі» заскокамі і прымірэнцтвам да ўсіх відаў апартунізму; зьезд зварачае ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі на ажыўленьне дзейнасьці права-апартуністычных элемэнтаў і на тое, што права-апартуністычныя вылазкі выяўляюцца ў сучасны момант таксама і ў спробах дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва, прычым мы маем цеснае перапляценьне правых і «левых» у іх сумесной барацьбе супроць генэральнай лініі партыі і выпрабаванага кіраўніцтва Ленінскага ЦК УсеКП(б).

2. Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту ў далейшым працягваць цьвёрды курс на індустрыялізацыю і на павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці, разьвіваючы ў першую чаргу тыя галіны прамысловасьці, якія працуюць на мясцовым сырцы (торф, лес, лён, будаўнічыя матар'ялы, пераапрацоўка с.-г. прадуктаў і інш.). З гэтай мэтай неабходна дабіцца максымальнага выкананьня плянаў капітальнага будаўніцтва бягучага году і забясьпечыць далейшае ўзмацненьне разгортваньня будаўніцтва новых фабрык і заводаў. Адзначаючы нездавальняючую работу прамысловасьці ў галіне зьніжэньня сабекошту і павышэньня якасьці прадукцыі, а таксама недавыкананьне заданьняў па валавой прадукцыі, зьезд лічыць першачарговай задачай у рабоце партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый зьнішчэньне гэтых прарываў і поўнае выкананьне прамфінпляну. Неабходна таксама дабіцца поўнага правядзеньня ў жыцьцё дырэктывы партыі аб адзіначальлі.

3. Разгортваньне прамысловасьці і сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, павялічэньне прадукцыі прамысловасьці і павышэньне таварнасьці сельскай гаспадаркі востра ставяць пытаньне аб разгортваньні ўсіх відаў транспарту, які нават у сучасных умовах не поўнасьцю спраўляецца з задачамі, высоўваемымі ўсёй народнай гаспадаркай.

Зьезд даручае ЦК зьвярнуць асаблівую ўвагу дарожнаму будаўніцтву, аўтамабілізацыі рэспублікі, паляпшэньню чыгуначнага і воднага транспарту.

У сувязі з рэарганізацыяй сыстэмы кіраўніцтва і дэцэнтралізацыі апэрацыйных і гаспадарчых функцый неабходна ўдзяліць больш увагі чыгуначнай гаспадарцы з боку ўсіх партыйных арганізацый і савецкіх органаў.

4. Матар'яльнае становішча рабочае клясы палепшылася. Аднак, затрудненні ў апошні час у забесьпячэньні рабочага насельніцтва мясам і тлушчамі, недахоп на рынку раду прамысловых тавараў, а таксама бюракратызм і нягібкасьць апарату каапэрацыйных арганізацый, недастатковы кантроль з боку рабочых над яго работай, адбіваюцца на ўзроўні рэальнай зарплаты рабочых.

Выходзячы з гэтага, зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту распрацаваць рад мерапрыемстваў па вышукваньні дадатковых крыніц забесьпячэньня рабочага насельніцтва (разгортваньне рыбнай гаспадаркі, агародняй справы і інш.) і па найбольш рацыянальным скарыстаньні маючыхся харчовых рэсурсаў.

Зьезд даручае партарганізацыям узмацніць сваю ўвагу да работы спажывецкае каапэрацыі і даручае ЦК перагледзець арганізацыйную сыстэму спажывецкай каапэрацыі ў мэтах ае спрашчэньня, патаньненьня і паляпшэньня работы каапэрацыйных органаў, забясьпечваючых рабочае насельніцтва.

5. Асабліва значэньне набывае таксама паляпшэньне работы прафсаюзаў, якія яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці і недастаткова ачысьцілі свой апарат ад бюракратычных і права-апартуністычных элемэнтаў, і рашучага зьніш[illegible]ня маючыхся недахопаў у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва (парадноасьць, фразэрства, іпжэ-ўдарніцтва).

6. У галіне сельскай гаспадаркі неабходна дабіцца рашучага і поўнага выпраўленьня памылак і скажэньняў, ні ў якім выпадку не дапушчаючы прымусу ў галіне гаспадарчых адносін з серадняком, а таксама ў пасыўнасьці, апусканьні рук, што роўналежна адмаўленьню ад кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі. Неабходна разгортваць далей калгасны рух, усямерна ўзмацняючы яго; дабіцца таго, каб калектыўная гаспадарка зьявілася ўзорнай, навочна паказваючы перавагі калектыўнай гаспадаркі перад дробнай індывідуальнай. У рабоце калгасаў ужываць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Неабходна ўзмацніць і разгортваць саўгасы, становішча якіх пакуль што зьезд лічыць яўна нездавальняючым.

Адначасова не дапускаць недаацэнкі індывідуальнай бядняцка-серадняцкай сялянскай гаспадаркі, якая ўсё яшчэ адыгрывае буйную ролю ў сельскай гаспадарцы рэспублікі.

7. Зьезд лічыць зусім нездавальняючай работу партарганізацый сярод бедноты наогул і ў прыватнасьці па арганізацыі і кіраўніцтве работай батрацка-бядняцкіх груп. Зьезд падкрэсьлівае ўсю важнасьць гэтай работы, асабліва для справы далейшага разгортваньня калгаснага руху, канстатуе, што дагэтуль у радзе мясцовых арганізацый маецца ігнараваньне і недаацэнка гэтай работы. Зьезд даручае ЦК дабіцца рашучага пералому ў гэтай галіне.

8. Асаблівую ўвагу зьезд прапануе зьвярнуць на праблему жывёлагадоўлі. Разьвіцьцё жывёлагадоўлі набывае выключнае значэньне як таму, што скарачэньне стада ставіць пад пагрозу нармальнае забесьпячэньне рабочых і забесьпячэньне прамысловасьці сырцом, гэтак і таму, што ва ўмовах БССР жывёлагадоўчы напрамак сельскай гаспадаркі зьяўляецца пераважным.

Зьезд заклікае ўсе партыйныя арганізацыі зьвярнуць максымум увагі на гэту задачу, дабіваючыся поўнага і своячасовага выкананьня пляну па разгортваньні жывёлагадоўчай галіны ў калгасах і саўгасах. Адначасова неабходна дабіцца пералому ў разьвіцьці жывёлагадоўлі ў індывідуальным сэктары сельскай гаспадаркі.

9. Усе віды с.-г. каапэрацыі знаходзяцца ў вельмі нездавальняючым ста-новішчы, у выніку недастатковай увагі з боку партыйных арганізацый, дрэннай работы самой сыстэмы па арганізацыі новішчы, у выніку недастатковай увагі і кіраўніцтве нізоўкай, дрэннай працы па абслугоўваньні каапэраванага насельніцтва і збору паёў, доўгага і зацяжнага вырашэньня пытаньняў аб разьмежаваньні функцый між паасобнымі відамі с.-г. і крэдытнай сыстэмай.

Улічваючы гэта, зьезд прапануе ЦК у бліжэйшы час прыняць адпаведныя пастановы ў адносінах арганізацыйнага і матар'яльнага ўзмацненьня ўсіх відаў с.-г. каапэрацыі, у першую чаргу жывёлагадоўчай і папяводчай.

10. У ліку важнейшых чарговых задач XIII зьезд КП(б)Б падкрэсьлівае перад усёй КП(б)Б і ўсімі савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі задачу падрыхтоўкі і пасьпяховага правядзеньня загатоўчай кампаніі (збожжа і бульба-загатоўкі, загатоўкі тэхнічных культур, экспартныя загатоўкі і інш.).

Неабходна ўжо зараз пачаць шырокую падрыхтоўку ўсёй КП(б)Б да гэтай важнейшай задачы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падрыхтоўку ўсяго хлебазагатоўчага і каапэрацыйнага апарату, каб ён мог поўнасьцю выканаць у час загатоўкі тыя вялізарнейшыя задачы, якія на яго ўскладаюцца.

11. Улічваючы слабасьць партыйнай арганізацыі на вёсцы, зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту прыняць меры да далейшага ўзмацненьня вясковых партарганізацый і ўзмацненьня пралетарскага ядра, у прыватнасьці шляхам накіраваньня перадавых рабочых - камуністых на вёску і павышэньня ідэалёгічнага ўзроўню партарганізацый на вёсцы (узмацненьне выхаваўчай работы, курсы перападрыхтоўкі, заочнае навучаньне і г. д.). Зьезд асабліва падкрэсьлівае задачу ўзмацненьня савецкай работы на вёсцы, асабліва шляхам паляпшэньня работы нізавых зьвяньняў сельсаветаў і ўзмацненьня кіраўніцтва саветамі з боку партарганізацый.

12. Выкананьне вялізарных задач, якія ставяць перад партыяй у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, сустракае недахоп надраў, як адну з асноўных перашкод пасьпяховага выкананьня гэтых задач. Партыя рашуча выправіла памылкі былога кіраўніцтва Наркамасьветы, яков скажана ўстаноўку партыі і не праводзіла клясавай лініі ў падрыхтоўцы кадраў.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б далейшае і няўхільнае ажыцьцяўленьне работ па выхаваньні пралетарскіх надраў, ставячы, як мінімальную задачу, поўнае выкананьне пяцігодкі па кадрах.

13. XIII зьезд канстатуе, што КП(б)Б за справаздачны пэрыяд дабілася паляпшэньня свайго сацыяльнага і якаснага складу за кошт новага прыцёку рабочых ад варштату і ўзмацненьня ўвагі да пытаньняў рэгуляваньня сацыяльнага складу партыйнай арганізацыі (з 1 студзеня 1929 г. па 1 красавіка 1930 г. процант рабочых узьняўся ў КП(б)Б з 59,5 проц. да 66,9 проц., а процант рабочых ад варштату і батрацкіх прыбылёў з 40,1 проц. да 46,1 проц.). Далейшае ўзмацненьне бальшавіцкага адзінства і павышэньне клясавай баяздольнасьці КП(б)Б патрабуе ад ЦК і ўсёй партыйнай арганізацыі неаслабнай увагі да пытаньня ўцягненьня ў рады партыі рабочых ад варштату, перадавых і прыкладных на вытворчасьці, дабіваючыся значнага ўзмацненьня росту за кошт работніц, тэмп ўцягненьня якіх да гэтага часу адстае ад агульнага тэмпу росту партыі.

Прызнаючы недастатковым рост партыі на вёсцы, у першую чаргу за кошт сельска - гаспадарчых рабочых і батракоў, зьезд лічыць неабходным скансцентраваць увагу ўсёй партарганізацыі на задачах узмацненьня росту вясковых партарганізацый за кошт сельска-гаспадарчых рабочых, батракоў, беднякоў і перадавых сераднякоў - калгаснікаў, забясьпечыўшы пры гэтым таксама ўзмацненьне тэмпу ўцягненьня ў партыю с.-г. работніц, батрачак і калгасьніц.

14. Зьезд асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць перабудовы, максымальнага паляпшэньня ўсёй сыстэмы партыйна-масавай работы як на прадпрыемствах, так і ў вёсцы. Партыйна - масавую работу неабходна пабудаваць так, каб яна была прыстасавана да ўзросшых запатрабаваньняў рабочай клясы, а таксама ўлічвала наяўнасьць новых пластоў рабочых. Асабліва неабходна прыстасаваньне партыйна - масавай работы да ўмоў прадпрыемстваў, перашоўшых на бесьперапынны рабочы тыдзень, ахоп начных зьмен. У вясковай партарганізацыі патрэбна забясьпечыць значна большае разгортваньне і паляпшэньне форм і мэтадаў парт.-масавай работы. Зьезд даручае ЦК КП(б)Б ужыць усе захады да ажыўленьня і актывізацыі дзейнасьці добраахвотных таварыстваў, асабліва Асоавіяхіму, «Праф няпісьменнасьць», «Саюз ваяўнічых бязбожнікаў» і г. д.

15. Становішча са справай тэарытычнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кіруючых партыйных кадраў, а таксама са справай павышэньня тэарытычнай падрыхтоўкі, асабліва нанава прынятых членаў партыі, зьезд лічыць нездавальняючым. Неабходна палепшыць у яваным і колькасным сэнсе камплектаваньне слухачамі і выкладчыкамі сыстэмы партасьветы (СПШ, Камвуз, завочнае навучаньне і г. д.), палепшыць матар'яльнае забесьпячэньне слухачоў, дабіцца пералому адносін мясцовых парторганаў да справы адбору слухачоў для сеткі партасьветы і да сыстэмы завочнага навучаньня. Неабходна выкарыстаць надыходзячы асеньня-зімовы пэрыяд для інтэнсыўнага разгортваньня партыйна - выхаваўчай працы.

Зьезд лічыць зусім неабходным дабіцца хуткага і сапраўднага пералому ў гэтай справе і прапануе ЦК ужыць для гэтага патрэбныя меры.

16. У выніку недастатковай увагі партыйных арганізацый, работа сярод работніц і сялянак значна паслабла. Работа сярод работніц набывае асаблівае значэньне ў сувязі з ростам жаночай працы ў прамысловасьці і прыцёкам на вытворчасьць кадраў новых работніц. Работа сярод батрачак і бядняцка-серадняцкіх жаночых мас вёскі адстае ад палітычных і гаспадарчых задач, якія павінны быць вырашаны партыяй у сувязі з сацыяльнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі. Лічачы зусім недапушчальным [illegible]ае становішча работы сярод работніц і сялянак, зьезд заклікае ўсе партарганізацыі да рашучага пералому ў гэтай галіне, якая зьяўляецца адным з важнейшых галін партыйнай работы.

17. XIII зьезд КП(б)Б адзначае, што студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б даў правільную ацэнку нездавальняючага становішча ЛКСМБ. На аснове пастаноў студзеньскага пленуму вызначыўся некаторы перапом у бок паляпшэньня масава-палітычнай работы камсамолу і павышэньня яго ўдзелу ў гаспадарчай рабоце на прадпрыемствах і ў вёсцы. Аднак, і дагэтуль зусім нездавальняючым застаецца партыйнае кіраўніцтва камсамолам. У паасобных арганізацыях наглядаецца недаацэнка ролі і значэньня камсамолу, ігнараваньне і пагардлівыя адносіны да работы сярод моладзі.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту прыняць рашучыя меры да выпраўленьня недахопаў работы акруговых і раённых арганізацый у справе партыйнага кіраўніцтва камсамолам.

18. Разгортваньне самакрытыкі ў радзе арганізацый КП(б)Б зьезд лічыць недастатковым. Недастатковае разгортваньне самакрытыкі затрудняе неабходны ўдзел шырокіх мас рабочых у сацыялістычным будаўніцтве, у выпраўленьні недахопаў гаспадарчай работы, у барацьбе з бюракратызмам.

Зьезд са здавальненьнем адзначае пасьлядоўна праводзімую Цэнтральным Камітэтам барацьбу са зьявішчамі заціску самакрытыкі, якія зьявіліся асноўнай формай скажэньня лёзунгу самакрытыкі ў БССР.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту і ўсім партыйным арганізацыям у далейшым праводзіць бязьлітасную барацьбу з выпадкамі заціску самакрытыкі і ўзмацніць партыйнае кіраўніцтва справай разгортваньня самакрытыкі.

19. Зьезд лічыць неабходным дабіцца рашучага паляпшэньня работы ўсіх арганізацый КП(б)Б па ўзмацненьні абароназдольнасьці рэспублікі, па вялізацыі працоўных мас, па ўзмацненьні сапраўднай сувязі рабочых мас з часьцямі Чырвонай арміі.

Ня гледзячы на неаднаразовыя пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб палітычным забесьпячэньні абслугоўваньня штогадовых прызываў і звальненьня з Чырвонай арміі, гэтыя дырэктывы дагэтуль ня ўсюды з дастатковай паўнатой выконваюцца, асабліва ў частцы адсейваньня клясава-чужых элемэнтаў і забесьпячэньня правядзеньня самапрызываў, а таксама ня ўсюды дамабілізуемыя своячасова скарыстоўваюцца на месцах на адпаведнай савецкай і іншай грамадзкай рабоце.

20. Працягваючы і ў далейшым бязьлітасную барацьбу з нацыянал апартунізмам, з беларускім нацыянал - дэмакратызмам, КП(б)Б павінна адначасова зьвярнуць увагу на барацьбу з актывізуючымся вялікадзяржаўным рускім шавінізмам, які зьяўляецца [illegible] перашкодай на шляху аўладання пралетарыятам працэсам будаўніцтва нацыянальнай культуры. Ажыўленьне яўрэйскага шавінізму, правы шавінізму польскага патрабуюць таксама значна большай мабілізацыі ўвагі партыі на барацьбу з правамі шавінізму ўсіх масьцей.

Узмацненьне работы па інтэрнацыянальным выхаваньні пралетарскіх мас, далейшая інтэрнацыяналізацыя прадпрыемстваў і ўстаноў, забесьпячэньне далейшага росту надраў беларускага пралетарыяту, а таксама пралетарыяту з нацменшасьцяй, выхаваньне пралетарскіх кадраў культурнага будаўніцтва, далейшае пасьпяховае правядзеньне беларусізацыі—забясьпечыць будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту ўзмацніць работу па правядзеньні беларусізацыі і весьці бязьлітасную барацьбу з недаацэнкай значэньня беларусізацыі, як моцнага сродку ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту.

Адзначаючы ненатурае паспабленьне работы сярод нацменшасьцяй, зьезд даручае партарганізацыям узмацніць работу па культурным і гаспадарчым абслугоўваньні нацменшасьцяй, у прыватнасьці зьезд лічыць неабходным поўнае ажыцьцяўленьне праграмы па гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак.

21. Канстатуючы, што партыя прышла на XIII зьезд згуртаваным і ідэйна маналітным атрадам бальшавікоў-ленінцаў, зьезд заклікае ўсіх членаў партыі далей замацоўваць сталёвае адзінства нашай партыі навакол генэральнай лініі камуністычнай партыі і яе ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

„Не дапусьцеце закінуць вяроўку на шыю змагароў“

ХВАЛЯ АБУРЭНЬНЯ ПРАЦОЎНЫХ СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКІХ ВЕШАЦЕЛЯЎ

Да пратэсту супроць кат ўскіх прысудаў фашысцкага суда

Чырвоная дапамога ў Польшчы (МОПР)

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

У сераду, 11 чэрвеня, акруговы суд у Львове прысудзіў да кары сьмерцю праз павешаньне Ізраіля Гірша, Самуіла Югэнда і Нафтале Пропэра, абвінавачаных у пашырэньні камуністычнай літаратуры і ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Украіны. Чацьверты абвінавачаны, Акіў Каган, быў апраўданы, але ён затрыманы ў турме, бо пракурор падаў заяву ў вышэйшы суд аб скасаваньні прыгавору ў адносінах да гэтага абвінавачанага.

Прыгавар сьмерці, які вынесены на падставе падазрэньня ў камуністычнай прапагандзе, зрабіў надзвычайнае ўражаньне сярод працоўных мас Львова і ўсяе Польшчы.

Тры прысуды сьмерці — гэта адказ польскага фашызму на рэвалюцыйны рух, які ўсё больш паглыбляецца ў Польшчы. Польскаму фашысцкаму ўраду і яго крываваму галаве Пілсудскаму не даволі масавых расстрэлаў дэманструючых беспрацоўных, не даволі душэньня ў крыві хваляваньняў сялянскіх мас і нацыянальна-вызваленчага руху на акупаваных землях, не даволі ўсё больш узмацняючагася страшэннага зьдзеку над палітычнымі зьняволенымі, прыстасаваньня страшэнных сярэднявяковых катаваньняў. Ва ўмовах фашысцкага кризісу, які ўсё больш паглыбляецца, і ўзмоцненых баёў пралетарыяту, фашысцкі ўрад хоча праз прысуды сьмерці за камуністычную прапаганду тэрарызаваць працоўныя масы, зламаць іх барацьбу за вызваленьне.

У той час, калі акруговы суд у [illegible]ве выносіў свой катаўскі прыгавар, польскі фашызм трыумфальна прымаў паслаьніка італьянскага фашызму, міністра замежных спраў Грандзі. Прыгадорам да сьмерці 3-х абвінавачаных у львоўскім працэсе польскі фашызм кладзе пячатку на супрацоўніцтва з крывавым Мусаліні, якое ўсё больш узмацняецца.

Львоўскі прысуд — гэта ня толькі адказ на ўзрастаючае абурэньне сярод працоўных мас Польшчы, гэта таксама сыгнал усё больш узмоцненых падрыхтовак да вайны супроць Савецкага Саюзу. Польскі фашызм добра ведае, што шырокія масы працоўных адносяцца з нянавісьцю да крыжовага паходу на СССР, які падрыхтоўваецца, што яны гатовы абараняць пралетарскую дзяржаву.

Супроць новага злачынства польскага фашызму павінен раздацца магутны голас пратэсту. З падзямельня Польшчы Пілсудскага мы зварачаемся да працоўных мас усяго сьвету з гарачай адозвай:

ВЫРВЕЦЕ З КІПЦЮРОЎ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ Т. Т. ГІРША, ЮГЭНДА І ПРОПЭРА!

Не дапушчайце да таго, каб катаўская рука закінула вяроўку на шыю барацьбітоў за вызваленьне пралетарыяту, сялянства і прыгнечаных польскім імпэрыялізмам народаў!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ЧЫРВОНАЙ ДАПАМОГІ Ў ПОЛЬШЧЫ (МОПР).

Пратэстуюць рабочыя Нямеччыны

БЭРЛІН, 20. Учора, позна вечарам, каля будынку польскага консульства ў Бэрліне адбылася дэманстрацыя мападых рабочых, якія пратэставалі супроць сьмяротнага прысуду, вынесенага у Польшчы тром камсамольцам. Дэманстранты каменьнем павыбівалі шыбы ў будынку консульства.

Надобныя-ж дэманстрацыі пратэсту адбыліся ў Гамбургу. Агенцтва «Вольф» паведамляе, што у сувязі з гэтым начальнік пратакольнага аддзелу міністэрства замежных спраў граф Татэнбах выказаў жаль польскаму пасланьніку ад імя міністэрства замежных спраў і абяцаў, што будзе праведзена падрабязнае расьсьледаваньне гэтай падзеі.

Голас дзеячоў разумовай працы

БЭРЛІН. У сувязі з прысудам да кары сьмерцю з польскіх камуністых МОПР Нямеччыны і рад выдатных дзеячоў разумовай працы паслалі тэлеграмы пратэсту Пілсудскаму, прэзыдэнту польскай рэспублікі і старшыні сойму.

У гэтых тэлеграмах высунута патрабаваньне неадкладнага скасаваньня барбарскага прысуду.

Хваля масавых арыштаў у Заходняй Беларусі

ВІЛЬНЯ, 20. ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПАЛІ�цЫЯ і ЖАНДАРМЭРЫЯ ПРАВЯЛІ МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў 3-Х ПАВЕТАХ НАВАГРАДЧЫНЫ.

ПАВОДЛЕ ПАПЯРЭДНІХ ДАНЫХ, ЛІК АРЫШТАВАНЫХ ПЕРАВЫШАЕ 100.

Нам перадаюць з Масквы

20 чэрвеня. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта)

САРТАВАНЬНЕ НАСЕНЬНЯ ПРАВЕСЬЦІ ПА-БАЯВОМУ

Наркамзем Саюзу, падаючы вялікае значэньне павышэньню якасьці насеньнятя матар'ялу і поўнаму скарыстаньню яго на засеўныя мэты, запрапанаваў усім саюзным рэспублікам ужыць меры да своячасовага і поўнага ахопу апрабаваньнем гатункових засеваў.

У прынцыпасьці, БССР усю работу па апрабацыі і рэгістрацыі гатункових засеваў павінна праводзіць паводле пляну, распрапанаванага цэнтральнай кантрольнай насеньнай станцыяй.

Гэта пастанова Наркамзему мае асаблівае значэньне ў сувязі з ажыцьцяўленьнем пастановы Саўнаркому Саюзу ад 28 мая аб пляне папарнай, уборачнай і асеньняй засеўнай кампаніі.

ДА ВЫРАШЭНЬНЯ МЯСНОЕ ПРАБЛЕМЫ

Нарада ў акц. т-ве «Саюзмяса», якая адбылася гэтымі днямі, пастанавіла перадаць калгасам Саюзу 460 тысяч сьвіноматак вясеньняга апароса. Усю работу правядзе «Животноводсоюз».

МЕНСКІЯ ЧЫГУНАЧНЫЯ МАЙСТЭРНІ — ВСНГ БССР

Пры машынааб'яднаньні ВСНГ СССР гэтымі днямі адбылася нарада, прысьвечаная будаўніцтву абсталяваньня для фабрык - кухань.

Нарада ўхваліла пастанову аб перадачы беларускаму ВСНГ менскіх чыгуначных майстэрань, якія адыходзяць ад НКШЭ. Гэтыя майстэрні павінны будуць выпускаць розных металёвых вырабаў у 1930-31 годзе на 5 міл. руб., а пры паступным пашырэньні абсталяваньня, давесьці вытворчасьць да 15 міл. руб.

ВАЖНАЯ НАРАДА

У бліжэйшым часе ў Наркамземе СССР адбудзецца нарада пралетарыяткі Наркамзему усіх рэспублік па пытаньні ўстанаўленьня разьмеру сродкаў па будаўніцтва с.-г. індустрыі ў 1930-31 г.

У плян будаўніцтва ўваходзіць пабудова млыноў, рысавых заводаў, інкубатараў, ільна-пянька-апрацоўчых заводаў, крухмальень, кансэрвных, маслазаводаў і г. д.

КАДРЫ МЭТЭАРАЛЁГАЎ

Гідра-мэтэаралёгічны камітэт БССР на раз ставіў пытаньне аб падры

XIII зьезд КП(б)Б

Спрэчкі па справаздачы Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б

Прамова тав. Ігнатоўскага

Таварышы, наша партыя за пэрыяд, перажыты ад XII да XIII зьезду, дабілася вялізарных посьпехаў. Гэтыя посьпехі былі забясьпечаны, дзякуючы уздыму мас рабочых, дзякуючы вялізарнай рабоце нашай партыі і дзякуючы выразнай правільнай бальшавіцкай лініі як нашага ЦК, так і ЦККК.

Я ня буду, таварышы, апісваць усіх тых нашых посьпехаў, якія намі дасягнуты па рэканструкцыі гаспадаркі ў горадзе і на вёсцы, ня буду таварыць аб тэй вялізарнай барацьбе, якая з посьпехам праводзілася супроць галоўнай нашай небясьпекі—правага ўхілу, супроць зьвязанага з ім беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх масьцей. Таварышы, калі мы гаворым аб тых дасягненьнях, якія зроблены намі, мы ня можам не адзначыць, не падкрэсьліць некаторых пытаньняў, якія для нас ня скончаны і далёка ня скончаны.

Бязумоўна, адным з важнейшых такіх пытаньняў, на якіх прыдзецца і ЦККК і ЦК вельмі завастрыць сваю ўвагу—гэта будзе барацьба з тым самым правым ухілам, бо, якраз мы, таварышы, бачым, што правы ўхілісты акапаўся і, мне думаецца, што яго млын, дзякуючы таму, што ваду на яго млын, льлюць «левыя» загібшчыкі, меле з некаторымі патугамі набыць вядомы палітычны капітал. Звычайна пачынаюцца такія, бачыце, цікавыя «разговорчыкі»: «перараскулачылі», «перакалектывізавалі», «перабагулілі» і г. д., а адсюль робіцца вывад: ня трэба было раскулачваць, ня трэба было калектывізаваць. Усё гэта робіцца ў форме, я-б сказаў, часам нават і «левай», прычым у некаторых момантах мяжа паміж «левымі» і правымі так згладжваецца, што яе ня прыкмеціць. Правы млын меле і яшчэ будзе малоць, прыкрываючыся вельмі часта, нават, і «левымі» лёзунгамі.

З нацыянал-дэмакратызмам зьвязаны ў нашых ўмовах антысэмітызм, што мне прынішла асабіста назіраць на працэсе Баршай. Зараз, паводле даных ЦКК, пройдзе спраў па антысэмітызьме павялічыўся і, мне здаецца, што калі пакапацца, дык апрача тых прычын, якія зусім правільна адзначыў т. Калнін, гэта павялічэньне антысэмітызму будзе зьвязана таксама прапарцыянальна ў тых ці іншых месцох вось з гэтым выступленьнем супроць нас нацыянал-дэмакратаў з беларускім нацыянал - дэмакратызмам. Нацыянал-дэмакратызм звычайна прыкрываецца ў савецкіх умовах, але там, за мяжой, ён адразу робіцца нацыянал-фашызмам і праводзіць сваю лінію да канца, бо сутнасьць нацыянал-дэмакратызму ў тым, што адзіны клясавы наш пралетарскі рэвалюцыйны фронт, наша дыктатура пралетарыяту замяняецца адзіным нацыянальным бяклясавым фронтам, а калі магчыма, то і дыктатураю буржуазіі, ці інакш кажучы нацыянал-фашызмам. Вось чаму так працягваецца рука паміж фашыстымі там за кардонам і паміж нацыянал-дэмакратамі тут.

Каб мне не рабіць так, як іншыя прамоўцы, бо ў мяне засталося, здаецца, з мінуты, я пастараюся скараціць свае агульныя заўвагі, каб перайсьці бліжэй да справы,—перайсьці да акадэміі, якую тут зусім правільна закраналі і аб якой трэба, бязумоўна, тут сказаць некалькі слоў.

У БАН былі прарывы. Вы чыталі ў газэтах многа такіх прарываў, чыталі аб прарывах у тэрміналёгіі, і ў слоўніку, і ў друкаванай прадукцыі акадэміі нявытрыманыя, ідэалёгічна-варожыя нам творы. Нават знайшоў сабе месца на старонках нашай акадэмічнай прэсы такі «славуты» фашысты, як Янка Станкевіч.

Акрамя таго, што было ў газэтах, можна падаць і іншыя факты. Ня так даўно да мяне прышоў адзін таварыш і кажа: «чаму акадэмія нас шкурнікамі называе? Якія мы шкурнікі?»—Гэтыя «шкурнікі» (скурнікі)—гэта саюз гарбароў. Куды лепш замест «скурнік» ужыць слова «гарбар». Нарэшце, можна было-б і яшчэ якое іншае слова прыдумаць, а нашы ўзялі наўдалае слова «скурнік» і атрымаўся цэлы саюз «шкурнікаў».

Я адзначаю, што цэлы рад прарываў быў. Але разам з тым, трэба адзначыць некаторыя плюсы, бо калі мы скажам, што ў нашай справе толькі прарывы, дык гэта-ж не акадэмія, такой акадэміі ня трэба трымаць, яе трэба закрыць неадкладна. Ёсьць, таварышы, некаторыя плюсы, на якія я хацеў зьвярнуць увагу, не затым, каб супакоіцца на гэтых плюсах, але каб паказаць, што гэтыя плюсы можа і ня вельмі вялікія, але ёсьць, на што партыя, ЦК і ЦККК трэба зьвярнуць увагу, каб у далейшым гэтыя маленькія плюсы зрабіць вялікімі.

У БАН ёсьць ячэйка. Яе ня было на мінулым зьезьдзе нашай партыі. Я лічу, што гэта плюс. У часе чысткі, у часе праверкі, вельмі глыбокай праверкі, вельмі — я-бы сказаў — грунтоўнай праверкі выявілася, што наша ячэйка здаровая. Мы пасьпелі ўжо вызваліцца ад чужых нам элемэнтаў. У нас вядзецца і работа калгасу імя БАН і павінен адзначыць, работа добрая. Мы выступалі ў рабочых клюбах і на рабочых сходах. Такіх плюсаў, можа і невялічкіх, пакуль можна было-б налічыць многа. На іх зусім ня трэба супакойвацца—трэба ісьці далей і павялічыць гэтыя плюсы. Трэба ЦК і ЦККК зьвярнуць яшчэ большую ўвагу на БАН, каб гэтыя плюсы пераважылі нашы вялізныя мінусы, якія ў БАН ёсьць.

На жаль, тав. Калнін мала мог спыніцца на пытаньні аб кадрах. Я лічу, што нідзе не зьяўляецца так паказальным значэньне пытаньня кадраў, як у акадэміі. Гэта ня значыць, што я не прызнаю значэньня кадраў у іншых галінах нашай работы, яны там маюць значэньне, але гавару, што паказальным гэта пытаньне якраз робіцца ў акадэміі.

Я падаю толькі пару лічбаў і вам стане ўсё ясна. У акадэміі 130 навуковых працаўнікоў, камуністых толькі 13, што складае 10 проц., менш чым сярэдняя лічба савецкай адміністрацыйнай установы, бо там, як я памятаю, тав. Гей вызначыў 18 проц.

Гэта, таварышы, бязумоўна вялізны мінус. Зусім інакш справа стаіць з асьпірантамі. Што тут зрабіла партыя? А вось што зрабіла: усяго ёсьць 32 асьпіранты, з іх 21 камуністых, што складае 60 проц. Вось дзе загадка плюсаў і мінусаў. Вось дзе развязваецца пытаньне дзьвюма маленькімі лічбамі: 13 проц. і 60 проц. Ясна, мне здаецца, кожнаму: ёсьць як быццам дзьве акадэміі, ёсьць і акадэмія, дзе 13 проц. камуністых, але ў ёй расьце другая акадэмія, дзе 60 проц. з лішнім камуністых.

ЦК і ЦККК трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на пытаньне кадраў. Я яго асабліва падкрэсьліваю не таму, што я лічу, што гэта наядучнае пытаньне — не. Ёсьць яшчэ цэлы рад пытаньняў, але гэта адно з вельмі важных пытаньняў і яго важнасьць вы асабліва ясна бачыце на прыкладзе акадэміі.

Цяпер асабіста пра мяне, аб маіх старых асабістых памылках. Я друкаваў увосені мінулага году ў нашай прэсе, што мною зроблена, каб паправіць мае асабістыя памылкі ў навуковых працах. Я выступаў на шырокіх рабочых сходах, чытаў курс ва унівэрсытэце і пініках заўваг і нездавальненьня да гэтага часу ня было. Зараз, праз два тыдні, выходзіць мая новая кніжка. Добрая будзе кніга ці не, тут я не магу сказаць. Недахопы, зразумела, будуць, але такіх памылак і недахопаў, якія былі ў мяне раней, я спадзяюся ў ёй ня будзе.

Прамова тав. Дамброўскага

Работа ЦККК, праробленая за справаздачны пэрыяд, праходзіла пры актыўным удзеле партыйных і беспартыйных мас. Праведзеная работа праходзіла поўнасьцю ў адпаведнасьці з пастаўленымі задачамі гэнэральнай лініяй партыі.

Я хачу спыніцца на тых вучастках работы, дзе адчуваецца недастатковы ахоп работай органамі кантрольнай камісіі.

Першае пытаньне, гэта адносна крытыкі і самакрытыкі. Якія мы маем у гэтай часьці недахопы і дасягненьні? Па справаздачным дакладзе Цэнтральнага Камітэту партыі многа гаварылі і далі выстарчальную, вычарпальную характарыстыку аб стане крытыкі і самакрытыкі. Я хачу даць адзінку і падаць факты, якія гавораць аб тым, што ў нас нават у некаторых вытворчых ячэйках, як выявіла праверка і чыстка радоў партыі, крытыка і самакрытыка пастаўлены яшчэ даволі кепска. Мы заўсёды кіраем і больш за ўсё абвінавачваем у гэтым савецкія ячэйкі. Трэба сказаць, што дрэнна абстаіць у адносінах крытыкі і самакрытыкі і ў некаторых вытворчых ячэйках. Крытыка і самакрытыка ў вытворчых ячэйках і на самой вытворчасьці павінна быць больш вострай, больш зубастай. Між тым, у некаторых вытворчых ячэйках былі ганеньні на рабкораў. Былі факты недалюбліваньня рабкораў, і гэта сьведчыць аб тым, што мы на гэтым вучастку павінны як належыць папрацаваць. У сувязі з неразуменьнем лёзунгу партыі аб самакрытыцы і крытыцы, у некаторых ячэйках справа даходзіла да прышываньня ўхілаў і загібаў. Справа перадавалася ў судовыя органы для разгляду на таварышоў, якія адважыліся выступіць з крытыкай тэй ці іншай асобы і тым самым прыводзілася да заціску самакрытыкі.

Сёньня, калі ўсе партарганізацыі на партыйных канфэрэнцыях раённых і акруговых, на пленумах, на партсходах і г. д. ставяць пытаньне барацьбы з антысэмітызмам, усё-ж на гэтым вучастку ў нас ня ўсё добра. Мы маем у асобных вучастках, г. ё. у прамысловых цэнтрах, як, напрыклад, на транспарце, такое становішча, што справа барацьбы з антысэмітызмам па сёньняшні дзень абстаіць вельмі дрэнна. Ёсьць асобныя выбрыкі праўда, ня масавыя зьявішчы, але асобныя грубыя ўчынкі ў адносінах да яўрэяў-рабочых, працуючых на транспарце. Нядаўна мы мелі такі факт, што над адным яўрэем так зьдзекваліся і дайшло да таго, што на яго кідалі гарачае жалеза, павалілі і пабілі яго, а партыйцы і камсамольцы, якія прысутнічалі пры гэтым, па-прымірэнцку аднесьліся, тлумачачы гэта жартамі.

Яшчэ адно пытаньне, на якім тав. Калнін мала спыніўся, гэта хваравітыя зьявішчы ў камсамоле. У камсамоле назіраем рост хваравітых зьявішч, між тым, для таго, каб выправіць гэтыя зьявішчы і ачысьціць камсамольскую арганізацыю ад чужых, варожых элемэнтаў, мы вельмі мала зрабілі. Мы гэта рабілі ад часу да часу, але каб грунтоўна ўзяцца разам з партыйнай арганізацыяй, разам з акруговымі і раённымі камітэтамі партыі—гэтага ў нас ня было і таму намі невыстарчальна вывучаны ўсе гэтыя хваравітыя зьявішчы.

Асобныя камсамольцы свае выбрыкі паказалі ў трацкісцкай апазыцыі, у правым ухіле, а таксама хваравітыя зьявішчы ў камсамоле яскрава выявіліся ў пытаньнях калектывізацыі і раскулачваньня. Таму мы павінны ўзяцца за гэту справу тым больш, што гэта зьяўляецца нашай непасрэднай работай, тым больш, што на некаторых акруговых арганізацыях праводзіцца чыстка камсамолу. Гэта чыстка камсамолу ў асобных ячэйках і раёнах праводзіцца невыстарчальна над кіраўніцтвам партыйных арганізацый.

Практыку чысткі і праверкі радоў партыі і тыя мэтады работы мы павінны перанесьці ў работу камсамольскіх арганізацый.

Прамова тав. Жолудава

Цэнтральная Кантрольная Камісія КП(б)Б за справаздачны пэрыяд у сваёй рабоце мае рад посьпехаў, асабліва гэтыя посьпехі трэба падкрэсьліць у справе барацьбы за генэральную лінію партыі ў справе разгортваньня самакрытыкі. ЦКК КП(б)Б рашуча вяла барацьбу з тымі правымі і «левымі» апартуністымі, якія імкнуліся сьцягнуць партыю з правільнага ленінскага шляху. ЦКК КП(б)Б выкрывала глушыцеляў самакрытыкі і вяла з імі жорсткую барацьбу.

У часе правядзеньня генэральнай праверкі і чысткі радоў КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б забясьпечыла кіраўніцтва гэтай важнейшай работай, і таму генэральная праверка і чыстка партыйных радоў дала вялікія станоўчыя вынікі.

Вынікі праверкі і чысткі партыйных арганізацый паказваюць, што палітычны ўзровень часткі партыйцаў надзвычай нізкі, што падчас на павышэньне тэарытычнага ўзроўню асабліва вясковых камуністых аддавалася мала ўвагі. І таму на пытаньне тэарытычнай падрыхтоўкі трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, у падыходзячым навучальным годзе партасьвету трэба паставіць на адпаведную вышыню.

Другое пытаньне, гэта адносна чысткі савецкага апарату. Я хачу спыніцца на некаторых адмоўных зьявішчах у гэтай рабоце. Я хачу паказаць, што некаторыя нізавыя прафарганізацыі зусім слаба ўдзельнічалі ў праверцы і чысткі савецкага апарату. Нават партыйныя ячэйкі ў асобных выпадках у гэтай рабоце прымалі надзвычай слабы ўдзел. Перад партыйнымі ячэйкамі і нізавымі прафарганізацыямі трэба рашуча паставіць пытаньне аб неабходнасьці іх удзелу ў справе паляпшэньня работы савецкага апарату. У радзе месц наш нізавы савецкі апарат працуе вельмі дрэнна. Яшчэ не скарочаны лік пасьпяжэньняў, не навучыліся хутка ажыцьцяўляць дырэктывы партыі, не навучыліся правяраць выкананьне сваіх уласных пастаноў. У сувязі з гэтым мы на мясцох мелі і рад скаржэньняў партыйных дырэктыў.

Нарэшце, пару слоў скажу аб будаўніцтве. ЦКК УсеКП(б) і савецкі ўрад вынесьлі рад пастаноў аб тым, што мы да будаўніцтва павінны праводзіць адпаведную падрыхтоўку, што павінны пачынаць будаўніцтва ва ўсіх адносінах належным парадкам падрыхтаванымі. На сёньняшні дзень можна сьмела сказаць, што ў радзе месц гэтыя дырэктывы ня выконваюцца: будаўніцтва пачынаецца бяз плянаў, без чарцяжоў, без адпаведнай падрыхтоўкі. Аб гэтым выразна сьведчаць тыя факты, якія выяўлены абсьледваньнямі. Аднак, ні гледзячы на гэта, мы яшчэ не дабіліся таго, каб будаўніцтва праводзілася танна і добраякасна.

Гэтыя моманты вымагаюць большай увагі да будаўніцтва, вымагаюць таго, каб кантроль над ходам будаўніцтва быў пастаўлен значна вышэй, чым ён стаяў да гэтага часу.

Прамова тав. Канакоціна

Абвастрэньне клясавай барацьбы выклікае актыўнасьць нашых ворагаў і на ідэалёгічным фронце. Мы ведаем, што ў сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы паказвае свой няпрыглядны твар і яўрэйскі і беларускі шавінізм, але ня сьпіць і вялікадзяржаўны расійскі шавінізм

Мы за апошнія часы мелі выступленьні вялікадзяржаўных расійскіх шавіністых у нашых навуковых установах. Праф. Шчапоцьцеў заявіў, што ён не жадае вывучаць «замежную» беларускую мову. Праф. Афанасьеў заявіў у выдавецтве, што ён свае працы будзе друкаваць выключна на «расійска-ленінскай» мове, бо ніякай другой мовы ён не прызнае. Праф. Воўк-Левановіч у сваіх разважаньнях аб беларускай мове імкнуўся зьвесьці беларускую мову да падмовы. На зьезьдзе ўжо адзначалася, што вялікадзяржаўныя шавіністы ня толькі бамбардыруюць нашу нацыянальную палітыку тут у нас у савецкай Беларусі, але імкнуцца і ў другіх саюзных рэспубліках перашкаджаць правільнаму правядзеньню нацыянальнай палітыкі. Перада мною цікавейшая кніжка, нядаўна выданая дзяржаўным выдавецтвам РСФСР у колькасьці 10 тысяч экз., ухваленая дзяржаўным вучоным саветам, як падручнік для школ другой ступені. У гэтай кніжцы пішацца аб тым, што яўрэі на Беларусі зьявіліся ад... старой арміі. Даслоўна там сказана так: «Сярод яўрэяў рамесьнікаў шмат краўцоў, бо да рэвалюцыі ў Менску стаяла шмат войска і краўцом на яго было шмат работы». І далей пішацца: «На падставе ўжо адзначанай вышэй вялікай колькасьці сярод гарадзкога яўрэйскага насельніцтва БССР краўцоў, будуюцца ў сучасны момант буйныя электрыфікаваныя швэйныя фабрыкі: ў Віцебску, Менску і Гомелі». Вось вам «вучонае» тлумачэньне індустрыялізацыі нашай краіны, вось вам правільнае асьвятленьне правядзеньня нацыянальнай палітыкі. І гэта робіцца ў Маскве ў 1930 годзе, і гэта ўхваляецца ГУС'ам. Праўда, мы падняслі з гэтага повану полам, мы настаялі на тым, каб гэту кніжку не прадавалі.

Мне ўспамінаецца адначасова з гэтым другая кніжка, напісаная супроць антысэмітызму, над назвай «Клясавы вораг пад маскай», аўтара Аляксандрава, тыраж 150 тысяч экз. Там пішацца: «Некаторыя таварышы, якія прыяжджаюць у Маскву, бачаць, што каля Аляксандраўскага, цэнтральнага Маскоўскага Беларуска-Бальтыцкага вакзалу, усе крамы і ларкі захоплены яўрэямі». А далей ён піша: «Нельга судзіць на адной Маскве і па адным кутку Масквы, што ўсё захвачана яўрэямі».

Вось так даведзена, што можна любому талкаваць і па-антысэміцку і супроць антысэмітызму. Такая даведка сьведчыць аб тым, што вялікадзяржаўны шавінізм ня толькі ў нас, у Беларусі, але і па-замежамі шкодзіць правядзеньню нацыянальнай палітыкі ў нас.

Мы маем яшчэ адзін з цікавейшых прыкладаў. У 1930 г. часопісь «Просвещение национальностей» — орган Цэнтральнага Камітэту Саюзу Работнікаў Асьветы—піша аб беларусах так: «Хилый, изможденный мужичек в белых лаптях, в белой свитке, с огромной головой на белом туловище, напоминает тонконогий гриб с большой трухлявой шляпкой. Волосы — грязный войлок,—слились на голове в большой ком. Их не разнять, не остричь» і г. д. Я прывёў гэтыя прыклады для таго, каб паказаць, як вялікадзяржаўны шавінізм паказвае свой твар. Сьвядома ці пясьвядома—аб гэтым гаварыць ня варта. Нас-жа цікавіць тое, што гэтыя кніжкі разьлічаны на чытача, нават і рэкамэндуюцца вучням, якія па гэтых кніжках будуць вывучаць адну з саюзных рэспублік—БССР.

На барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам ЦКК і акруговыя кантрольныя камісіі павінны ўзяць усе сілы і біць з ўсёй рашучасьцю. Разам з гэтым трэба адзначыць, што наш друк у барацьбе з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам мала зрабіў: Мне ўспамінаецца, што ў газэце «Зьвязда» паявіліся толькі тры артыкулы—адзін аб вялікадзяржаўным расійскім шавінізьме ў Залінейным раёне Гомелю і другі гэта аб ананімных анкетах, якія былі складзены сярод студэнцтва, трэці агульна напісаны артыкул тав. Асьмова. За ўвесь год тры больш менш грунтоўныя артыкулы. Ці гэта зьяўляецца мабілізацыяй увагі партыі, ці гэта зьяўляецца мабілізацыяй нашай увагі ў барацьбе з такім шкодніцтвам, як вялікадзяржаўны шавінізм? Я думаю, што не. На гэты вучастак трэба зьвярнуць больш увагі.

Другое пытаньне—гэта аб правах беларускага нацыянал-дэмакратызму. Мы мелі такія факты, у якіх нацыянал-дэмакратычныя элемэнты проста пераклікаліся з нацыянал-фашыстымі Заходняй Беларусі, а іншы раз яшчэ горш, як гэта выявілася са справы Купцэвіча.

Купцэвіч быў членам партыі, намесьнікам рэдактара «Зьвязды», быў намі пасланы ў Інстытут Чырвонай Прафэсуры. Праўда, ён адтуль ужо адкліканы нашай Цэнтральнай Кантрольнай Камісіяй, але справа ня ў тым, што мы гэта выправілі (гэта добра), а справа ў тым, што па гэтым фронце чужыя людзі пралазяць і робяць пераклічку з нацыянал-фашызмам. У дадатак да таго, што тут тав. Калнін гаварыў аб Купцэвічу, я хачу сказаць, што гэты Купцэвіч на старонках друку піша, што наогул ня можа ісьці гутаркі аб пралетарскай літаратуры ў Беларусі, бо яе няма. Ён выступіў у літаратурнай часопісі «Ўзвышша» з установкай аб тым, што наогул зусім спрэчным зьяўляецца пытаньне аб магчымасьці існаваньня пралетарскай літаратуры ў пэрыяд дыктатуры пралетарыяту. Супроць Купцэвіча была ўзьнята кампанія па выкрыцьці, па ім ударылі і як толькі ўдарылі на Купцэвічу, фашысты Луцкевіч узяўся абаранять Купцэвіча ў ліку іншых, каго мы ўзялі пад бязьлітасны агонь крытыкі. У газэце «Наперад» нацыянал-фашыстыя пішуць так: «чарга прышла да другіх... Дубоўкі, Пільняка, Антося Адамовіча, Купцэвіча і інш. Ім закідаюцца тыя-ж самыя «праступкі», гэта: «нацыянал-дэмакратызм», дробна-буржуазная псыхалёгія і «заступніцтва за кулакоў». Ва ўсім гэтым людзі са скрыўленай душой бачаць «скрыўленьне бальшавіцкай лініі», для нас цікава тое, што фашысты Луцкевіч бярэ над абарону і Купцэвіча.

Вы бачыце на гэтых прыкладах, як фашыстыя зараз-жа скарыстоўваюць усе тыя хібы, якія ў нас здараюцца ва ўмовах Савецкай Беларусі. І правільна зрабіла ЦКК, калі ўдарыла на Купцэвічу. Але гэта ні ў якай меры ня можа нас задаволіць і супакоіць.

Пасьля таго, як мы білі па «Ўзвышшы», па «Полымі», па хібах на літаратурным фронце, пасьля гэтага адзін з кампаніі Купцэвіча піша новы твор, я ня буду называць яго прозьвішча, бо гэты твор яшчэ не надрукаваны. Ён піша паэму аб калектывізацыі. І ведаеце, як ён малюе калектывізацыю? Селяніна пасадзілі і вязуць у калгас, селянін ня хоча адтаворваецца, а яго вязуць і пяюць як салаў'і пра калгас.

Уся гэта паэма зьяўляецца паклёпам на кіруючую ролю рабочага ў калектывізацыі, уся гэта рэч зьяўляецца кулацкім, сурова кажучы, лістом супроць калектывізацыі.

Я гавару аб гэтым таму, каб давесьці, як нашы ворагі скарыстоўваюць супроць нас асобныя прарывы на фронце культуры. Другі фашысты Станкевіч, які сядзіць у Вільні, так характарызуе становішча на ідэалёгічным фронце ў нас: «Беларуская літаратурная сучаснасьць канцэнтруецца амаль выключна толькі ва Ўсходняй Беларусі—Менску, дзе для разьвіцьця беларускай літаратуры маюцца найбольш адпаведныя варункі. «Фашысты ня могуць ня прызнаць таго, што ў нас маюцца адпаведныя варункі, ну што-ж, «дзякуй» і за гэта. А вось далей аб пісьменьніках ён кажа: «Праўда, многа з гэтых пісьменьнікаў у Менску, ці то з прычыны чырвонае цэнзуры, ці паводлуг уласнага перакапаньня, выламліваюцца з агульна-беларускай плыні і ідуць па чужым для нас, міжнародным шляху...» Гэтых пісьменьнікаў нацыянал-фашыстыя ня любяць, а вось тых, якія адбіваюць кулацкія і абпарніцкія настроі, яны лічаць сваімі і з-за мяжы вітаюць іх.

Таварышы! Той, хто хоць на хвіліну адыходзіць ад клясавай лініі на культурным фронце, той, жадае ці не жадае ён гэтага, дапамагае клясаваму ворагу, той льле ваду на млын нацыянал-фашызму Заходняй Беларусі, які ў саюзе з польскім фашызмам на сёньня так шалёна рыхтуецца да нападу на СССР і ў першую чаргу на БССР, як фарпост Савецкага Саюзу тут, на заходняй мяжы. КП(б)Б, стоячы на чале нацыянальна-культурнага будаўніцтва, увесь час вядзе барацьбу за клясавы зьмест нацыянальнай культуры і XIII зьезд вярэ ніці больш завострыць увагу ўсёй КП(б)Б на пытаньнях барацьбы за культуру пралетарскую па зьмесьце і нацыянальную па форме. У гэтай барацьбе органы ЦКК павінны адыгрываць вялікую ролю.

Прамова тав. Зелянкоўскага

ЦКК КП(б)Б правяла вялікую работу ў галіне барацьбы супроць правага апартунізму, самага небясьпечнага на даным этапе, супроць рэштак контр-рэвалюцыйнага трацкізму, «левых» загібаў і прымірэнцтва да іх. ЦКК КП(б)Б вялікую работу правяла ў справе разгортваньня крытыкі і самакрытыкі. У цэлым радзе акруг і раёнаў, дзе былі дапушчаны скажэньні лёзунгу партыі аб самакрытыцы, ЦКК КП(б)Б рашуча ўдарыла па ўсякіх гэтых скажэньнях.

Усім вядома аб тым, што ў Гомелі мелі месца факты заціску самакрытыкі. Але, дзякуючы ўмяшанню ў гэту справу ЦК і ЦККК КП(б)Б, партыйная арганізацыя мабілізавана на выпраўленьне тых памылак, якія былі дапушчаны ў справе разгортваньня самакрытыкі. Аднак, і на сёньня мы можам яшчэ канстатаваць факты, калі асобныя раённыя арганізацыі і асобныя ячэйкі ня вынесьлі адпаведнага ўроку з тых фактаў, якія мелі месца. Такія факты мы маем у Чэчэрскім і Буда-Кашалёўскім і некаторых асобных вытворчых ячэйках Гомельшчыны. Па гэтых момантах трэба рашуча ўдарыць.

На зьезьдзе трэба падкрэсьліць і аб тым, што некаторыя партарганізацыі зусім дрэнна кіруюць рабселькораўскім рухам, у сувязі з чым мелі месца рад недапушчальных узаемаадносін з рабселькорамі з боку асобных нізавых зьвеньняў. Некаторыя партарганізацыі зусім выпусьцілі з-пад увагі адзін з відаў грамадзкасьці, які дапамагае нашай партыі ўскрываць усялякія недахопы ў рабоце.

Тав. Ляўкоў у сваёй прамове гаварыў адносна кадраў работнікаў для кантрольных камісій. Я павінен падкрэсьліць, што ў гэтым пытаньні, ня гледзячы на рад дырэктыў з боку ЦКК УсеКП(б), мы нашых кантрольных камісій як сьлед пэўнымі кадрамі работнікаў не ўмацавалі. Я тут асабліва маю на ўвазе інспэктуру таму, што ад яе падбору шмат што залежыць у нашай рабоце. Мы вельмі часта дабіваемся ад акруговых камітэтаў партыі, каб на работу ў КК адпусьцілі таго ці іншага таварыша, але з гэтага часта нічога ня выходзіць. На гэту работу, часам, пападаюць такія таварышы, якія ня зусім пасьпяхова, а то і дрэнна спраўляюцца з выкананьнем сваёй работы. Бо апарат КК-РСІ павінен быць больш гібкім, больш выразным у сваёй рабоце, чымся ўсякі іншы апарат. І калі наш апарат ня будзе ўкамплектаваны досыць падрыхтаванымі працаўнікамі, то работа будзе паляпшацца слаба.

Пару слоў аб рацыяналізацыі нашага апарату. Мы атрымалі некаторы эфэкт у 1927-28 годзе пасьля рэарганізацыі акруговых аддзелаў у інспэктараты. Аднак, пасьля гэтага па шляху рацыяналізацыі наперад мы рухаемся вельмі марудна. Трэба выпрацаваць пэўныя мерапрыемствы, каб хутчэй рацыяналізаваць савецкі і каапэрацыйны апарат. ЦКК-РСІ трэба выпрацаваць такое палажэньне, каб магчыма было больш шчыльна падыйсьці да пытаньня паляпшэньня, скарачэньня і пачэньня нашага савецкага апарату.

Прамова тав. Пушчына

Лінія Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б была зусім правільнай і цалкам адпавядаючай генэральнай лініі УсеКП(б). Наша партыя правяла сярод вясковай беднаты вялізарную работу, асабліва ў сувязі з калектывізацыяй, у выніку чаго значна ўзьнялася палітычная актыўнасьць беднаты і ўмацніўся саюз з серадняком. Мы ніколі ў практыцы сваёй работы ня бачылі такога вялікага ўздыму бядняцка - серадняцкіх мас. Па-мойму, дырэктывы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б нічога агульнага ня маюць з тымі, па сутнасьці, вялікімі памылкамі, якія мы на мясцох нарабілі. Дырэктывы Цэнтральнага Камітэту партыі былі даны зусім правільныя. Тое, што мы — мясцовыя работнікі — рабілі памылкі, мы іх рабілі таму, што, як тав. Сталін вызначыў і зусім правільна вызначыў, што мы страцілі роўнавагу, закружылася галава.

Такіх дырэктыў, бязумоўна, Цэнтральны Камітэт партыі не даваў і мы паролі вялікую адсьбяціну.

Некалькі слоў адносна таго, хто нам дапамагаў памыляцца. Тут трэба сказаць аб ролі нашага друку. Наш друк мае вялізарнейшыя дасягненьні. Агульная палітычная лінія нашых газэт бязумоўна, правільная. Але трэба казаць аб асобных памылках. Бязьмеце зводачкі, якія даваліся на БССР і па акругах: «ганебна адстае такі раён», «паранейшаму цягнецца ў хвасьце такі і такі раён», «кандыдатам на чорную дошку» бо на мала процантаў калектывізаваны, такі і такі раён».

У газэце «Зьвязда» буйным шрыфтам пісалася, напрыклад, «Жлобінскі раёк на сёньняшні дзень ужо раскулачан на 70 проц.».

Разам з тым трэба адзначыць, што Цэнтральны Камітэт, па-мойму, своячасова папярэдзіў сваёй пастановай дапушчаныя месцамі памылкі.

Прамова тав. Карнеева

Мне здаецца, што на XIII зьезьдзе нашай партыі пытаньне аб становішчы камсамолу павінна было стаць значна вастрэй, чым яно зараз стаіць. Патрэбна прааналізаваць, як камсамол дапамагаў партыі ў вырашэньні станчых задач, якія перад ім былі пастаўлены партыяй. Даючы поўны аналіз становішча камсамолу Беларусі, мы можам сказаць, што ў яго працы бязумоўна ёсьць посьпехі, якія цесна зьвязаны з усім посьпехамі рабочай клясы і асноўнымі мас сялянства пад кіраўніцтвам партыі Іх ні ў якім разе нельга падзяляць, бо на кожным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва камсамольская ініцыятыва была забясьпечана. За час паміж XII і XIII зьездамі камсамол меў цэлы рад палітычных прарываў. Недастаткова была мабілізавана камсамольская маса на барацьбу з правай небясьпекай. Бальшавіцкая самакрытыка ў камсамоле недастаткова разгорнута. Мы не маглі забясьпечыць актыўнага ўдзелу нашай арганізацыі ў сацыялістычным будаўніцтве. За гэты час ня было дастаткова кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый.

ЦК ЛКСМ і ЦК КП(б)Б своячасова завастрылі ўвагу на гэтых пытаньнях і намецілі рад важнейшых палітычных задач, якія пастаўлены перад нашай камсамольскай арганізацыяй на бягучы пэрыяд. Гэтыя задачы павінны стаць актуальнымі задачамі для таго, каб перабудаваць усю сыстэму нашай працы. Аднак, на сёньня мы павінны канстатаваць, што мы яшчэ поўнасьцю і з тэй неабходнасьцю, якая зараз патрабуецца, не змаглі рэалізаваць дырэктывы партыі і дырэктывы камсамольскай арганізацыі, і мы яшчэ ў дастатковай мэры ня маем таго, каб яна паварушала не часьцю тварам да галоўнейшых пытаньняў нашага будаўніцтва.

На шляхох да 16-га партзьезду

ЗАХОЎВАЮЧЫ АДЗІНСТВА СВАІХ РАДОЎ, ДАЮЧЫ ЖОРСТКІ АДПОР АПАРТУНІЗМУ, ПАРТЫЯ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК АДЗІНЫМ СТРОЕМ ІДЗЕ ДА 16-ГА ПАРТЗЬЕЗДУ

Партыйныя масы аднадушна ўхваляюць пастановы XIII зьезду КП(б)Б

Арганізацыя дала бязьлітасны адпор вылазкам правых

(Бабруйск)

Абгаварэньне тэзісаў да XVI партзьезду на Бабруйшчыне началося з 1-га чэрвеня і зараз падыходзіць да канца. Ячэйкі цалкам ухваляюць і далучаюцца да тэзісаў ЦК. Уносяцца практычныя прапановы і дадаткі да тэзісаў адносна ўзмацненьня калгасаў на лініі нэфэства, паляпшэньня работы сярод груп беднаты, падрыхтоўкі новых кадраў з калгасьнікаў, паляпшэньня работы сельсаветаў у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Бюро АК КП(б)Б па інфармацыі сакратара гаркому аб ходзе прапрацоўкі тэзісаў адзначыла:

«Ход прапрацоўкі тэзісаў яшчэ раз сьцьвярджае, што партарганізацыя, ідэалёгічна здаровая і бальшавіцкі вытрыманая, дала і дае рашучы адпор усякім вылазкам супроць генэральнай лініі партыі,—праваму ўхілу як галоўнай небясьпецы на даным этапе, так і «левым» загібам, рэштках контр-рэвалюцыйнага трацкізму і прымірэнчым адносінам да іх.

Побач з гэтым, бюро АК падкрэсьлівае некаторае ажыўленьне правых і «левых» апартуністычных элемэнтаў, якія ў некаторых ячэйках (мэблевая фабрыка, жылсаюз, Белдзяржбуд, абутнікі і інш.) скарысталі абгаварэньне тэзісаў для выступленьня супроць генэральнай лініі партыі для паклёпу на партыю, на яе ленінскі ЦК, абвінавачваючы іх у няправільнай лініі па калектывізацыі, на пэрэльвасьць пяцігодкі, скарыстоўваючы тыя цяжкасьці, якія мы зараз перажываем для дыскредытацыі ленінскага кіраўніцтва ЦК. Прычым правыя і «левыя» выступалі адзіным фронтам супроць генэральнай лініі.

Гэтыя ячэйкі замест рашучага адпору і асуджэньня права-апартуністычных і «левых» вылазак, замест мабілізацыі ўвагі ўсіх партыйцаў для барацьбы, супроць апартунізму спачатку аднесьліся прымірэнча, недаацанілі палітычнай важнасьці гэтых здарэньняў, што паказвае на некаторае прытупленьне палітычнага чуцьця ў паасобных парт'ячэйках і іх кіраўнікоў.

Бюро АК КП(б)Б адзначае вялікую ролю цэнтральнага органу КП(б)Б «Зьвязды», якая своячасовай сыпналізацыяй дапамагла парт'ячэйкам выправіць пад кіраўніцтвам райкому дапушчаныя імі памылкі».

Як асноўныя недахопы, якія мелі месца ў некаторых ячэйках пры абгаварэньні тэзісаў, трэба лічыць слабую падрыхтоўчую работу сярод беспартыйных рабочых, зусім слабае скарыстаньне матар'ялаў дыскусійных лісткоў пры абгаварэньні тэзісаў.

Выходзячы з гэтага, бюро АК КП(б)Б запрапанавала ўсім райкомам і гаркому яшчэ больш разгарнуць работу па прапрацоўцы т

БЕЗ КАРМАВОГА НАСЕННАВОДЗТВА

нельга вырашыць праблему мяса і тлушчаў

БССР можа і павінна забясьпечыць сябе ўласным насеньнем

Для гэтага трэба, каб кожны саўгас, калгас і індывідуальнік пэўную частку сваіх кармавых засеваў пакінуў на насеньне

Надаючы вялікую ролю жывёлагадоўлі ў разьвіцьці сельскае гаспадаркі БССР, трэба памятаць, што разьвіцьцё жывёлагадоўлі амаль у асноўным залежыць ад наяўнасьці кармавых рэсурсаў.

Трэба разгортваць практычныя мерапрыемствы як па разьвіцьці жывёлагадоўлі, так і па стварэньні кармавых рэсурсаў.

Арганізацыя кармавой базы—справа нялёгкая. Яна залежыць ад пасьяўнага і сваячасовага вырашэньня пытаньняў, якія спрыяюць разьвіцьцю культуры кармавых расьлін поля, пажаці і пашы, — ад наяўнасьці наведных відаў і гатункаў насеньня кармавых расьлін.

Забесьпячэньне адпаведнай колькасьцю і якасьцю насеньня кармавых расьлін зьяўляецца зараз адным актуальных і асноўных пытаньняў, хто хоча з посьпехам вырашыць праблемы мяса, малака, масла, павінны у першую чаргу вырашыць пытаньне забесьпячэньня насеньнем, зн. вырашыць праблему насеннаводзтва кармавых расьлін. Між тым, гэтых адносінах справа стаіць зусім пездавальняюча.

Усесаюзная нарада па насеннаводзтве, якая нядаўна адбылася, канстатавала, што прадукцыяй насенных саўгасаў, якая мяркуецца ад ураджаю 1930 г., можна забясьпечыць па разе культур вельмі нізкі процант затрабаваньня ў 1931 годзе па ўсім БССР. Так, напрыклад, па лугавых сьлінах — на 9,5 проц., віцы зімнай — 9,5 проц., пялюшцы — 1,2 проц., дубіне — 60,2 проц., сэрадэлі — 68,3 проц. Трэба агаварыць, што такім будзе балянс насеньня толькі ўмове поўнага выкананьня сёлетніх плянаў засеву па насеньне.

Такое становішча патрабуе: 1) поўнага выкананьня плянаў насеннаводзтва і насеннай кантрактацыі, 2) разгортваньня масавых мерапрыемстваў пагод насельніцтва за пакіданьне імі севаў на насеньне і нескарыстаньня іх на корм, 3) бязупыннага паляпшэньня насеннаводзтва на будучы па шляхам арганізацыі насеннаводных гаспадарак (калгасаў, саўгасаў) тым, каб забясьпечыць вытворчасьць патрэбнай колькасьцю насеньня і гэтым вызваліць нас ад неабходнасьці завозу насеньня.

Трэба адзначыць, што каапэрацыйнымі цэнтрамі, а таксама мясцовымі зямельнымі органамі аддаецца мала ўвагі насеннаводзтву, што тлумачыцца недаацэнкай імі значэньня гэтай справы.

Значны попыт па насеньне і канъюнктура насеннага рынку патрабуюць пашаркага разьвіцьця вытворчасьці насеньня ўнутры БССР. Вытворчасьць насеньня, як паасобная галіна сельскае гаспадаркі, можа быць лепш за ўсё забясьпечана ў спэцыялізаваных насенных гаспадарках, аб'яднаных у спэцыялізаваную сыстэму (Насенкалгассаюз, Насентрэст). Між тым, да гэтага часу пытаньне аб арганізацыі Насенсаюзу яшчэ ня вырашана. А некаторыя прадстаўнікі Белкалгасцэнтру лічаць нават, што на гэтым этапе часу гэта арганізацыя не патрэбна.

У выніку — шмат непаразуменьняў па мясцох. Сёлета, напрыклад, не адбылося вылучэньня насеннаводных калгасаў. Хістаньні ў арганізацыі насеннаводзтва павінны быць зьнішчаны. Трэба прымусіць саўгасную і калгасна - каапэрацыйную сыстэмы пастаянна займацца насеннаводзтвам. Трэба, каб яны забясьпечылі сябе насеньнем для ажыцьцяўленьня запраектаваных тэмпаў разьвіцьця сельскае гаспадаркі.

Такое недапушчальнае становішча, як штогадовы завоз у БССР вялікай колькасьці насеньня, павінна быць ліквідавана. Па практыцы мы наглядаем процілеглае. Калі прыняць завоз у 1926 г. за 100 проц., дык у 1930 г ён вызвіцца: па капюшыне— у 380 проц., па цімафееўцы — у 461 проц.; па віцы яравой — у 223 проц.; па лугавых травах — у 222 проц., па кораньплодах — у 823 проц.

Такім чынам, завоз насеньня кожны год павялічваецца. Гэта нецярпіма ня толькі з боку транспартных і валютных меркаваньняў, а і з таго пункту погляду, што завезенае насеньне не заўсёды падыходзіць да ўмоў Беларусі.

Трэба памятаць, што месца і ўмовы росту насеньня (у сэнсе глебавакліматычным) зьяўляюцца актуальнымі пытаньнямі пры скарыстаньні насеньня на засеў. У асноўным, трэба браць курс на акліматызаванае насеньне. Тав. Суворaў у паведамленьні аб работах беларускай станцыі інстытуту прыкладной батанікі і новых расьлін («Известия опытной агрономии», т. VII, № 6, 1929 г.) піша: «Канюшыннае насеннаводзтва ў рэспубліцы толькі яшчэ пачынае разьвівацца. Сваё насеньне ёсьць у вельмі абмежаванай колькасьці. Таму асноўная маса насеннага матар'ялу ўвозіцца з розных раёнаў Саюзу, часьцей за ўсё з Украіны, а часамі і з-за мяжы. Прыгоднасьць гэтай канюшыны ва ўмовах Беларусі яшчэ не даволі выяўлена. Часткова завозная канюшына тут хутка вышадае, моцна церпіць у часе зімоўкі, дае нізкі ўраджай. Калі расійская раньняя канюшына адзначылася ў нашых умовах параўнальна нізкім процантам зімаўтрываласьці, дык сярод заходня - эўрапэйскай канюшыны гэта зьявішча выявілася яшчэ больш выразна. Канюшына замежнага паходжаньня аказалася мала падыходзячай для ўмоў Беларусі».

Гэтага даволі, каб усьвядоміць неабходнасьць фарсаваньня мерапрыемстваў па вытворчасьці насеньня ўнутры краю. Аднак, вынікі насеннай кантрактацыі мінулага году гаворацьь, што па гэтым гаспадарчым фронце ў нас ня ўсё добра і што зараз трэба біць трывогу.

Магчымасьці, каб цалкам забясьпечыць насеньнем патрэбы будучага году, ёсьць. Трэба толькі, каб кожны саўгас, калгас і бядняцка - серадняцкая гаспадарка з ліку сваіх кармовых засеўных плошчаў значную частку пакінулі-б на насеньне.

Гэта мерапрыемства трэба ажыцьцявіць зараз, нават за лік памяншэньня кармавой прадукцыі. Толькі рашучымі крокамі сёлета забясьпечым нармальнае разьвіцьцё пашыраньня кармавых плошчаў у будучым годзе.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на засевы зімовай вікі, насеньне якое зьяўляецца зусім дэфіцытным. **Трэба дабіцца, каб усе плошчы засеву яе былі цалкам пакінуты на насеньне.**

Кожны аграработнік павінен гэтыя пытаньні паставіць у цэнтр сваёй работы, разгарнуць патрэбныя мерапрыемствы па забесьпячэньні насеньнем кармавой плошчы будучага году.

Трэба рашуча ставіць пытаньне аб стварэньні належных умоў для разьвіцьця насеннаводзтва кармавых расьлін, канцэнтруючы гэту работу ў спэцыялізаваных насенных гаспадарках (калгасах, саўгасах), якія вылучаюцца для гэтай мэты, вызначыўшы іх у спэцыялізаваную насеннаводную сыстэму.

Аграном БЯЛОЎ.

У кантрактацыі жывёлы няма зруху

Справа з кантрактацыяй жывёлы на 10 чэрвеня ня толькі не палепшылася, а, наадварот, па радзе аб'ектаў, нават, пагоршылася. Па буйной рагатай жывёле плян выканаць на 23,8 проц. супроць 24,1 проц. на 1 чэрвеня. Закантрактавана 32.163 галавы, замест 135 тысяч галоў, вызначаных плянам. Белмалжывсаюз выканаў плян на 28 проц. супроць 89,5 проц. на 1 чэрвеня. Закантрактавана 24.531 галава замест 86.000 галоў. Белкаапсаюз таксама не дабіўся зруху. Закантрактаваны 7.632 галавы замест 49.000.

Беларускія арганізацыі бадай ніякіх мер ня прынялі для фарсаваньня кантрактацыі жывёлы. Тэрмін кантрактацыі скончыўся яшчэ 1 мая, а плян на сёнешні дзень ня выкананы нават і на адну чвэртку.

Як стаіць справа з кантрактацыяй сьвіней? І тут процант выкананьня пляну некалькі зьнізіўся: 36 проц. супроць 36,3 проц. на 1 чэрвеня. Замест 50 тысяч сьвіней закантрактавана толькі 17.991.

Нязначнае павялічэньне па кантрактацыі парасят веснавога апаросу. На 1 чэрвеня плян быў выкананы на 20,3%, па 10-га чэрвеня—на 21,5 проц. Закантрактаваны апарос ад 3.220 матак замест 15.000 матак, вызначаных плянам. Белмалжывсаюзам плян выкананы на 27,6 проц., (закантрактавана 2.764 матак замест 10.000 матак). Белкаапсаюзам закантрактавана 456 матак замест 5.000, або... 9,1 проц. заданьня.

Рад округ далі зусім мізэрны процант выкананьня пляну. Магілеўская округа дала 17,7 проц., Мазырская—17,4 проц., Бабруйская—11,7 проц. Рэкорд пабіла Полацкая округа, якая выканала плян кантрактацыі парасят... на 2,6 проц.

Зусім невялікі зрух дасягнуты і ў кантрактацыі цялят. Гэта кампанія праваленa. На 10 чэрвеня плян кантрактацыі цялят выкананы толькі на 5,4 проц. Закантрактавана 8.062 галавы замест 150 тысяч галоў, вызначаных плянам. Белкаапсаюз выканаў плян на 4,3 проц. (закантрактавана 2.307 галоў замест 54 тысяч), Белмалжывсаюз даў 6 проц. заданьня—закантрактавана 5.755 галоў замест 96 тысяч галоў. Аршанская округа выканала 2,6 проц. заданьня, Гомельская—3,8 проц., Віцебская округа—2,3 проц.

Па кантрактацыі бараноў плян у сярэднім выкананы на 11,3 проц. супроць 6,4 проц. на 1 чэрвеня. Закантрактавана 5.646 галоў замест 50 тысяч. Белмалжывсаюзам плян выкананы на 9,3 проц., Белкаапсаюзам—на 15 проц.

Гэтыя лічбы яшчэ раз падкрэсьліваюць надзвычай патрабуючае становішча, створанае, галоўным чынам, нядбайнасьцю з боку кантрактуючых арганізацый.

Г.

Калгасы Бабруйшчыны перавыканалі пасеўны плян

Дабіцца поўнага выкананьня пляну сяўбы тэхкультур, баявых тэмпаў у апрацоўцы прапашных культур і поліва, падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ ВЯДЗЕЦЦА ЗЛАЧЫННА-МАРУДНА

На першым месцы

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Калгасы Бабруйскай акругі на першым месцы ў БССР па выкананьні пасеўнага пляну. На 15 чэрвеня яны скончылі сяўбу з перавышэньнем агульнага заданьня на 6 проц., а па ільне—на 21,7 проц.

Округа ў цэлым ужо таксама канчае сяўбу, выканаўшы 96,7 проц. Бабруйшчына перавыканала леташні веснавы пасеўны плян на 23.500 гэкт. — 7,5 проц.

***

З посьпехам скончыўшы веснавую сяўбу, калгасы Бабруйшчыны з уздымам узяліся за падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

У большасьці калгасаў Парыцкага раёну ўжо складзены пляны ўборкі ўраджаю. Жнівяркі, касаркі ўжо прыведзены ў парадак. Пасьпешна будуюцца гумна і сьвірны.

Старшыні калгасаў Любаньскага раёну на сваёй нарадзе абвясьцілі сябе ўдарнікамі і мабілізавацымі на час уборачнай кампаніі, абавязаўшыся разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі, калгаснымі брыгадамі і асобнымі калгаснікамі.

Любаньскі раён ужо заключыў сацыялістычны дагавор з Старадарожкім раёнам на лепшае правядзеньне ўборкі ўраджаю. Нарада калгасаў Бабруйскага раёну настанавіла распрацаваць па вытворчых нарадах у калгасах шырокую праграму падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю.

Калгас «Чырвоны працаўнік» абвясьціў сябе ўдарным па ўвесь час правядзеньня ўборачнай кампаніі.

А. МАГІДАЎ.

На што скардзяцца калгасы

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі праходзіць слаба. Увага працаўнікоў цэнтральных і місавых устаноў не мабілізавана вакол гэтай важнейшай і адказнай справы. І гэта, ня гледзячы на тое, што ўборка ўраджаю ў радзе раёнаў ужо пачалася (прыступілі да ўборкі балотных сенажацяй).

Зараз у Менску адбываецца акруговая нарада зямельных і каапэрацыйна-калгасных працаўнікоў. Тое, што гаворацьь на гэтай нарадзе мясцовыя працаўнікі і калгаснікі, поўнасьцю пацьвярджае сказанае вышэй.

У многіх калгасах не хапае ўборачных машын—жнівярак, касарак, спонвязалак. Гэта акалічнасьць, пры недахопе ў калгасах рабочых рук, патрабуе да сябе пільнай увагі.

Да гэтага трэба дадаць яшчэ адну акалічнасьць—старыя машыны не адрамантаваны. Пры тым многія з сельскагаспадарчых машын, пераданых калгасам ад раскулачаных гаспадарак, пазбаўлены важных частак, якія кулакамі былі вынуты і недзе закінуты. Да таго-ж калгаснікі ў масе сваёй мала знаёмы з гэтымі машынамі і самі іх рамантаваць ня могуць. Гэтыя машыны трэба зараз-жа дакладна агледзець і старанна адрамантаваць.

Калгасы скардзяцца на адсутнасьць запасных частак для машын. На складах Белсельснабу ёсьць запасныя часткі, але яны да калгасаў не даходзяць. Адбываецца гэта вось чаму. Белсельснаб патрабуе ад калгасаў—«прадстаўляйце нам заяўкі па форме, з падрабязным пералічэньнем тых запасных частак, якія вам патрэбны». Але члены праўленьняў калгасаў ня ведаюць дакладнае назвы гэтых частак (а колькасьць гэтых назваў даволі значная), дый і няма каму там складаць такія заяўкі па форме. Гэта непаразуменьне трэба неадкладна ўрэгуляваць, каб яно не тармазіла атрыманьня калгасамі запасных часьцей.

Назіраецца таксама няправільнае разьмеркаваньне сельска-гаспадарчых машын паміж калгасамі. Удзельнікі акруговай нарады падавалі факты, калі ў некаторых калгасах знаходзіцца па 30-40 жнівярак, што перавышае нармальныя патрэбы ў 2-3 разы, а ў той-жа час, у іншых калгасах жнівярак не хапае. Адсюль вывад—трэба хутчэй зрабіць перараз-меркаваньне ўборачных машын паміж асобнымі калгасамі.

Паляводсаюз зараз пасылае ў раёны новыя ўборачныя машыны. Аказваецца, што гэта перадача машын на месцы адбываецца агіднейшым чынам. Машыны пасылаюцца абынк, бяз толку, без папярэдняга агляду. А вынікі вось якія —Бярэзінскаму раёну прыслалі жнівяркі без пляцформ, Чэрвеньскі раён атрымаў жнівяркі без калёс, касаркі трактарныя накіраваны ў раёны, дзе няма трактараў. Усё гэта нэрвус калгаснікаў—ім прыходзіцца ў гарачы час пасылаць людзей у горад для дадатковага атрыманьня недасланых частак.

Калгасам патрэбны для ўборкі ўраджаю моцныя паракопныя базы. Паляводсаюз закупіў і завёз на месцы вазы, якія зусім не падыходзяць да нашых умоў: замест параконных—аднаконныя, акрамя таго, яны не прыстасаваны да нашых дарог—іх вузкі обад урэзваецца ў пясок і гразь. Многія калгасы застаюцца без вазоў, ёсьць калгасы, дзе пры наяўнасьці 30 коняй, толькі 2 спраўныя вазы. Старыя калёса за час засухі рассохліся і парассыпаліся. Не хапае пынавага жалеза для іх адрамантаваньня.

Калгаснікі заяўляюць, што яны ў «Зьвязьдзе» вычыталі абяцаньні Калгасцэнтру—«друкуем рабочай праграмы і пляны да ўборачнай кампаніі, чакайце», але дагэтуль гэтых плянаў не атрымалі.

Л. Н.

Мазыр—94,7 проц.

МАЗЫР. На 15 чэрвеня ў **Мазырскай акрузе засеяна** 134.858 гэктараў, што складае **94,7 проц. агульнага засеўнага пляну.** Калгасы засеялі 26.864 гэкт. (92,7 проц.), індывідуальны сэктар—107.994 гэкт. (95,9 проц.). Па ільне калгасы выканалі—93,7 проц. пляну, індывідуальны сэктар—93,9 проц., у сярэднім—93,9 проц.; па канаплях калгасы—81,8 проц., індыв. сэктар—77,8 проц., у сярэднім—78,4 проц.

Па збожжавых культурах плян у сярэднім выкананы на 100,2 проц., **па бульбе—на 88,6 проц.**

МАГІЛЕЎ—91,3 ПРОЦ.

МАГІЛЕЎ. **У Магілеўскай акрузе на 15 чэрвеня засеяна** 406.983 гэкт. ці **91,3 проц. агульнага пляну.** Калгасы выканалі—78,7 проц. пляну (засеяна 68.682 гэкт.), індыв. сэктар—94,4 проц. (338.301 гэкт.).

Па збожжавых культурах плян абодвума сэктарамі выкананы на 90 проц.; **па бульбе—110 проц.**, адпагадовых травах (віцы і сэрадэлі)—91,3 проц., канюшыне—71,2 проц. і іншых культурах—61,8 проц.

Па ільне плян выкананы калгасамі на 74,4 проц., індыв. сэктарам—85,6 проц., у сярэднім—83,9 проц.; па канаплях калгасамі—54,7 проц., індыв. сэктарам—71,8 проц., у сярэднім—на 69,6 проц.

КАРОБЧАНСКІ ФАСФАРЫТНЫ МЛЫН ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ

Ударым па гапавацяпах, якія зрываюць работу

З Мсьціслаўля паведамляюць, што РВК закрыў дарогу праз плаціну, па якой Каробчанскаму фасфарытнаму млыну прывозіўся сырэц і вывозілася гатовая прадукцыя. Фасфарытны млын спыняе працу.

Такім шляхам Мсьціслаўльскі РВК з ведама і згоды сакратара райкому партыі дабіваецца ліквідацыі фасфарытнага млыну беларускага хэм'абяднаньня (аднаго з трох прадпрыемстваў у Беларусі, якія вырабляюць мінэральныя ўгнаеньні) для таго, каб там арганізаваць млын па перамоле збожжа.

Не чакаючы пастановы адпаведных устаноў на гэтым пытаньні, кіраўнікі раёну нарашылі стварыць для фасфарытнага млыну такія ўмовы працы, каб ён сам закрыўся.

Закрыцьцё дарогі праз плаціну вымушае карыстацца вакольным шляхам, што падаражае кошт фасфарытнай мукі на 10 руб. на тону, а гэта фактычна зрывае працу млыну.

НА ПЛЕНУМЕ ЦСПСБ

Што выявіла самаправерка выкананьня сацыялістычных дагавароў

Прафарганізацыі не падыйшлі шчыльна да вытворчасьці

З дакладу тав. Аверына

ОЛЬШАСЬЦЬ ГАЛІН ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НЕДАВЫКАНАЛІ ВЫТВОРЧЫХ ЗАДАНЬНЯЎ

— Самаправерка,—кажа тав. **Аверын,** —пачалася са спазьненьнем па поўгода. Асабліва спазьніліся заводы Віцебскай акругі, завод «Энэргія», «Камуфлер» і інш. прадпрыемствы.

Праверка высьветліла, што ў выніку загортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, колькаснае выкананьне плянаў дзе вялікае павялічэньне ў параўнаньні з мінулым годам. Некаторыя галіны прамысловасьці (швэйная, панчошна-трыкатажная і махорачная) выканалі свой плян цалкам з перавышэньнем. Апяровая прамысловасьць набліжаецца да поўнага выкананьня свайго пляну. Але большасьць галін прамысловасьці і прадпрыемстваў недавыканалі сваіх вытворчых заданьняў.

Пры значным узросьце прадукцыйнасьці працы у сярэднім па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці, асабліва некаторых галінах (папяровая, паліграфічная, галянтарэйная, харчовая, швэйная і г. д.) заданьні ў большасьці прадпрыемстваў ня выкананы. Ёсьць нават такія галіны прамысловасьці, якія даюць паніжэньне прадукцыйнасьці працы ў параўнаньні з мінулым годам (керамічная).

Са зьніжэньнем сабекошту прадукцыі права стаіць таксама не на вышыні. Асабліва адсталі са зьніжэньнем сабекошту прадукцыі запалкавая прамысловасьць, абутковая, паліграфічная і тэкстыльная.

І ЯКАСЬЦЮ ПРАДУКЦЫІ—КЕПСКА

Дрэнна стаіць справа з паляпшэньнем якасьці прадукцыі, якая ў радзе галін прамысловасьці ня толькі не палепшылася, але, у параўнаньні з мінулым годам, яшчэ пагоршылася. Так, пры прымане прадукцыі ад гарбарні «Бальшавік» абутковай фабрыкай брак у асобных партыях дасягае 30 і больш процантаў. Адзначаны выпадкі (Гомель), калі рабочы новыя боты насіў толькі 8 гадзін, пасьля чаго адвальваліся падпоскі. Панчошная фабрыка выпускала панчохі з плямамі і часта блыталі нумары панчох. Швэйная прамысловасьць таксама дае частку прадукцыі дрэннай якасьці.

Друкарня Палесдрук зрабіла для беларгаліпродсаюзу 30 тыс. кніжак, прычым аказалася, што брашуроўка іх зусім не адавальняючая і значная частка пойдзе ў брак.

Выпадкі дрэннай якасьці прадукцыі наглядаюцца і па мэталяпрацоўчай прамысловасьці. Так, нядаўна на заводзе «Чырвоны Мэталісты» забракавана 100 штук сячкарань.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПРАМФІНПЛЯНУ

Ёсьць рад прадпрыемстваў, дзе прамфінплян зусім не ў выстарчальнай меры папулярызаваны сярод рабочых. Некаторыя прадпрыемствы першы квартал бягучага году працавалі без прамфінпляну. Завод **«Чырвоная Зара»** (Магілеў) прамфінплян атрымаў толькі 11-га студзеня г. году.

На заводзе «Адраджэньне» (Магілеў) рабочыя ня прымалі ўдзелу ў складаньні прамфінпляну і ў праверцы яго выкананьня. На Бабруйскім хлебазаводзе прамфінплян складзен у габінэце ЦРК, на завод не пераданы і рабочыя ня ведаюць аб прамфінпляне. На заводзе «Энэргія», «Дрэваапрацоўшчык», «Беларуска» і інш. значэньне прамфінпляну ня вывучана ня толькі рабочымі, але і кіруючым складам.

З давядзеньнем прамфінпляну да цэху, варштату і рабочых справа стаіць і зараз дрэнна. Так, на «Дубровенскай Мануфактуры», у выніку працы брыгадзіраў у часе праверкі, прамфінплян па ткацкім цэху даведзен да варштату, а па матальным—да калектыву. На гуце імя Домбаля аб прамфінпляне ведалі толькі майстры і адміністратары. На заводзе «Чырвоны Кастрычнік» (Аршанчына) у пачатку прамфінпляну быў складзен па цэхах, але рабочых аб гэтым не паведамілі. На заводзе «Пралетары» (Копысь) прамфінплян нават не даведзен да асобных заводаў рабочыя аб прамфінпляне нічога ня ведаюць. Майстар заводу № 3 заявіў, што ён да прамфінпляну ніякага датычэньня ня мае. Заўком гэтым пытаньнем ня цікавіцца. На Аршанскім чыгуначным вузле прапрацоўка прамфінпляну ў цэхах і зьменах не праводзілася, плян да цэхаў і варштатаў не даведзен.

ЗАМЕСТ АДЗІНАНАЧАЛЬЛЯ—БЕЗНАЧАЛЬЛЕ

Праверка выявіла, што ў радзе прадпрыемстваў дырэктыва аб адзінаначальлі ня выканана. Ёсьць факты, калі прафарганізацыі і адміністрацыя ня толькі не папулярызуюць дырэктыву аб адзінаначальлі ў масах, але нават ухіляюцца ад таго, каб браць на сябе адказнасьць за гаспадарча-апэрацыйнае кіраўніцтва прадпрыемствам. Асабліва гэта выяўляецца з боку цэхавай адміністрацыі.

Маюць месца і такія выпадкі, калі прафсаюзныя арганізацыі ўмешваюцца ў функцыі адміністрацыі. Так, напрыклад, прафарганізацыя здымае з вытворчасьці рабочага на грамадзкую працу, не паведамляўшы аб гэтым адміністрацыю. Або такія выпадкі, калі адміністрацыя здымае з работы прагульшчыкаў, а прафарганізацыя дабіваецца іх аднаўленьня.

ПРАФСАЮЗЫ СЛАБА КІРУЮЦЬ УДАРНІЦТВАМ

За апошні час значна ўзрасла актыўнасьць рабочай масы. Так, на швэйнай фабрыцы «Камінтэрн» арганізавана 27 ударных брыгад, якія працуюць з вялікай інтэнсыўнасьцю, але ўліку іх работы няма. На цукэрачнай фабрыцы (Магілеў) арганізавана 9 ударных брыгад, якія за кароткі час свайго існаваньня павысілі прадукцыйнасьць працы з 30 кгр. да 45 у дзень. На гуце «Ноўка» ўдарніца на шліфоўцы дае выпрацоўку 4.359 адзінак пры 1.93 проц. бою, у той час, як работніца няўдарніца дае толькі 1.641 адзінку і бою 6,13 проц. Ударная брыгада дрэваапрацоўчага цэху заводу «Чырвоны Мэталісты» ў колькасьці 18 чалавек зьбірае 75 арфаў, у той час, калі 25 рабочых зьбіралі толькі 67 арфаў.

Разам з ростам ўдарніцтва самаправерка выявіла ілжэ-ўдарнікаў. Мелі месца такія выпадкі, калі завод абвяшчаў сябе ўдарным, у той час, калі рабочыя ў сваёй большасьці ня ведалі аб ударніцтве, былі прагулы і г. д. Усё гэта выявіла самаправерка. Урэшце, трэба сказаць, што прафэсыянальныя арганізацыі слаба кіруюць ударніцтвам. Да гэтага часу ЦП саюзаў не сабралі поўных вестак аб ходзе самаправеркі.

Прафэсыянальныя арганізацыі павінны шчыльна падыйсьці да вытворчасьці, быць у курсе яе штодзеннага жыцьця, дапамагаць нізавым прафарганізацыям у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, каб тыя дэфэкты, якія мелі месца ў першым паўгодзьдзі, былі ліквідаваны.

Б.

Вынікі веснавой пасеўнай кампаніі

Прафсаюзы павінны выправіць памылкі і перагібы

З дакладаў т. т. Паніматка і Калодка

Веснавая сяўба па БССР набліжаецца да канца. У паўднёвых акругах — Мазырскай, Гомельскай, Бабруйскай—канчаецца засеў грэчкі, а ў паўночных акругах — тэхнічных культур. На 10-га чэрвеня засеўны плян выканан па рэспубліцы больш чым на 90 проц.

Які ўдзел прафсаюзаў у гэтай важнейшай палітычна - гаспадарчай кампаніі?

У выніку больш актыўнага ўцягненьня рабочых мас у практычнае ажыцьцяўленьне ўсёй работы партыі і савецкай улады назіраецца буйны рост калектывізацыі. Плянавыя меркаваньні на другі год пяцігодкі ў галіне калгаснага будаўніцтва набліжаюцца да поўнага выкананьня.

Прафсаюзы Беларусі накіравалі ў калгасы на пастаянную работу ў лік 25-ці тысяч 537 чалавек, заяў ад добраахвотнікаў паступіла 1.363. Сярод пасланых маюць вытворчы стаж ад 5 да 12 год — 44 проц., звыш 12 год—48 проц. і толькі 8 проц. — менш 5 год. 42,5 проц. адабраных—актывістыя-прафработнікі, 24 проц. — партактыў.

Для правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі прафсаюзы накіравалі на вёску каля 1.200 рабочых брыгад з 15.000 брыгадзіраў. На пасылку брыгад саюзы выдаткавалі каля 60 тыс. руб. На трактарную калёну сабрана 183 тысячы руб. Рабочыя брыгады прарабілі на вёсцы значную работу па арганізацыі калгасаў, загатоўцы насеньня, узмацненьні работы сярод беднаты і г. д.

У рабоце прафсаюзаў па вёсцы ёсьць і рад значных недахопаў. Рад прафсаюзаў правялі ня сур'ёзны падыход да падбору брыгад. Апошнія слаба інструктаваліся і ва многіх мясцох былі пакінуты бяз сувязі і кіраўніцтва.

З боку вышэйшых прафэсыянальных арганізацый ня было выстарчальнага рэагаваньня на перагібы ў рабоце паасобных брыгад. У некаторых мясцох самі прафсаюзныя арганізацыі скажалі партыйную лінію ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва і дапускалі выключэньне з саюзаў тых, хто не хацеў ісьці ў калгасы. Такія факты ёсьць па саюзе чыгуначнікаў, савецкіх і гандлёвых служачых, працаўсьветы і г. д.

Многія фабкомы, прадпрыемствы забылі аб сваіх 25-цітысячніках. Лісты апошніх застаюцца без адказу. Ніякай сувязі з пасланымі ў калгасы няма.

Прафсаюзы не разгарнулі на вёсцы масавай работы асабліва па растлумачэньні такіх важных партыйных дакумантаў, як артыкул тав. Сталіна і г. д.

Яшчэ да гэтага часу работа прафсаюзаў на вёсцы не перабудавана ў напрамку сыстэматычнай дапамогі арганізацыйна - гаспадарчаму замацаваньню калгасаў і падрыхтоўцы бяднякасерадняцкіх мас вёскі для арганізацыі новых калгасаў.

Якія задачы стаяць перад прафсаюзамі ў падыходзячай уборачнай і асеньняй кампаніі.

Прафсаюзы ў сваёй далейшай рабоце павінны весьці рашучае змаганьне за выпраўленьне дапушчаных памылак і перагібаў. Трэба бездакладна разгарнуць шырокую масавую растлумачальную работу сярод рабочых, калгаснікаў, бядняцка - серадняцкіх мас сялянства аб значэньні выкананьня пастановы ўраду БССР аб уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Уся работа павінна весьціся з такім разьлікам, каб канкрэтныя пляны ўборачнай і пасеўнай кампаніі былі абгавораны на вытворчых нарадах калгасаў і саўгасаў і сходах беднаты ў бліжэйшы час. Асеньні пасеўны плян павінен быць даведзен да кожнага калгасу і саўгасу і бядняцка - серадняцкай гаспадаркі.

Прафсаюзныя арганізацыі павінны бездакладна арганізаваць масавую праверку падрыхтаванасьці да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі ўсіх цэнтральных, мясцовых савецкіх і каапэрацыйных арганізацый. Ні адзін калгас і калгаснік, саўгас і саўгасны рабочы не павінны быць у баку ад сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў часе ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы.

Вось асноўныя думкі дакладаў—намесьніка Наркамзема БССР тав. **Паніматка** і загадчыка арганінструктарскага сэктару ЦСПСБ тав. **Калодка,** якія былі заслуханы на вячэрнім пасяджэньні пленуму ЦСПСБ 19-га чэрвеня г. г.

БЕРАЖЭЦЕ ТРАКТАР!

„...50 тысяч трактараў...—50 тысяч знарадаў, якія ўзрываюць стары буржуазны сьвет і пракладаюць шлях новаму сацыялістычнаму ўкладу на вёсцы“.... І. СТАЛІН.

Як скарыстоўваецца наша трактарная гаспадарка

Досьледы Менскай машына-спробнай станцыі Наркамзему заслугоўваюць увагі савецкай грамадзкасьці. Асноўная задача станцыі—шляхам навуковых досьледаў падабраць сыстэму і тыпы трактараў і с.-г. машын, якія найбольш падыходзяць да ўмоў Беларусі.

На станцыі вылучан у самастойную адзінку толькі адзін аддзел мотакультуры. Гэты аддзел спэцыяльна займаецца падборам трактараў і іншых машын для мэханічнай цягі ў сельскай гаспадарцы.

Досьледы па працягу раду год паказалі, што ва ўмовах Беларусі зусім магчыма, рэнтабэльна і мэтазгодна ўжываньне мэханічнай апрацоўкі глебы.

Асаблівай увагі заслугоўвае вывучэньне работы трактараў і плугоў на балоце. Вынікі досьледаў станцыі лягчі ў аснову канструкцыі балотных плугоў для ўсяго Саюзу. Станцыя падабрала таксама тып нармальнага трактарнага плуга, ужываньне якога ва ўмовах Беларусі дае на працягу году эканоміі 1.000.000 руб.

За апошні час станцыя шмат увагі аддала абсьледваньню трактарнай гаспадаркі ў Беларусі. Найбольш цікавыя вынікі дало абсьледваньне Койданаўскай машына-трактарнай станцыі і трактарных гаспадарак на Мар'інскім калгасе і на Магілеўшчыне.

На Койданаўскай станцыі пасьля агляду была наладжана работа 50 проц. трактарных плугоў, у сувязі з чым прадукцыйнасьць трактараў павялічылася на 35 проц. Тое-ж самае было зроблена і ў Магілеўскай акрузе.

Абсьледваньне выявіла рад недахопаў у трактарнай гаспадарцы. Апошняя не забясьпечана прычэпным інвэнтаром. Не хапае кваліфікаванай рабсілы для работы на машынах.

Гаспадарчыя арганізацыі—Белсельтрэста, Калгасцэнтр, Ільнапяньковае аб'яднаньне не падрыхтаваліся да прыстасаваньня трактараў.

Дагэтуль Наркамзем і іншыя зацікаўленыя арганізацыі ня ўжылі энэргічных мер да арганізацыі сеткі тэхнічнай дапамогі. Інструктаж Наркамзему ня мае магчымасьці ахапіць усю работу. Маладыя неспрактыкаваныя работнікі інструктары прадастаўлены самім сабе і ня маюць ніякага кіраўніцтва.

Вельмі дрэнна стаіць справа з рамонтам машын. Ёсьць толькі адна майстэрня для капітальнага рамонту трактараў, якая знаходзіцца ў Менску. **Але якасьць рамонту далёка нездавальняючая,** не гаворачы ўжо аб якасьці рамонту, які робіцца звычайна на розных прадпрыемствах як у чыгуначных майстэрнях і г. д. Адзначаны факты, калі трактары пасьля рамонту не даходзяць да месца работы і зноў становяцца ў рамонт.

Няўгодненасьць у заводзе трактараў стварыла надзвычай стракаты трактарны парк і вялікія труднасьці ў забесьпячэньні запаснымі часткамі. У Беларусь завезены трактары 17-ці розных марак. У сувязі з гэтым вельмі часта цяжка падабраць і адпаведны тэхнічны інвэнтар. У Менскай, Магілеўскай і інш. округах цэлы рад машын не скарыстоўваюцца, або выкарыстоўваюцца толькі на 25 проц. з-за адсутнасьці патрэбнага прычэпнага інвэнтару.

Трэба змагацца і з парадкасьцю ў выкарыстаньні трактараў. Часта выкарыстоўваюць трактар ня як рабочую машыну, а для дэманстрацый і розных выступленьняў.

Надзвычай востра стаіць пытаньне аб **арганізацыі правільнага выкарыстаньня трактараў у калгасах.** Асноўная маса калгаснікаў ня ведае ўмоў работы трактараў. У сувязі з гэтым у радзе калгасаў трактары выкарыстоўваюцца для ворыва невялікіх гарадоў і г. д.

Машына-спробная станцыя шмат увагі аддала падрыхтоўцы кадраў. За адзін толькі 1929-30 год ёю выпушчана каля 400 трактарных работнікаў. Станцыя правяла першую спробу падрыхтоўкі трактарыстых-калёнаважатых. Частка з іх накіравана ў округі ў якасьці інструктароў тэхнічнай дапамогі.

М. К-н.

НІВОДЗІН ТРАКТАР НЕ ПАВІНЕН ВЫЙСЬЦІ СА СТРОЮ

Колькасьць трактараў у сельскай гаспадарцы БССР расьце з кожным месяцам. Калі ў 1929 годзе ў калгасах працавала ўсяго 56 трактараў, дык на сёнешні дзень колькасьць іх вырасла да 310, у кан

Абураючыя факты ў Лепельскай больніцы

Мы патрабуем неадкладнага аднаўленьня складу мэдпэрсаналу Лепельскай больніцы

Рэдакцыяй былі атрыманы допісы селькораў Лепельшчыны **Барана і Сымона** аб галаванасіях адносінах да справы аховы здароўя працоўных у Лепельскай райбольніцы. Гэтыя заметкі былі накіраваны на расьсьледваньне ў сэкцыю РСІ пры Лепельскім РВК, і зараз мы атрымалі копію акту камісіі ў складзе прадстаўніка ад РСІ, доктара і прадстаўнікоў ад рабочай брыгады, на расьсьледваньні гэтых заметак. Усе нашы сумненьні разьбіты начэнт. Анісаць у гэтай заметцы ўсе недапушчальныя ўчынкі, якія маюць месца ў Лепельскай больніцы, мы ня маем магчымасьці, падамо толькі частку характэрных фактаў.

Больніца і амбуляторыя знаходзяцца ў хаатычным становішчы. У галоўным флігелі надзвычай брудна, на сталох заляюцца кавалкі хлеба, шкарлупа яек, брудная вата і інш. А калі ўвайсьці ў хірургічны пакой, дык там можна заўважыць яшчэ больш сумны малюнак. Стол пакрыты густым пластом пылу, а на ім ляжаць заіржаўленыя хірургічныя інструманты бятучага карыстаньня, як пінцэты, скальпэлі і інш. Ня лепшае становішча і ўізаляцыйным пакоі, у якім ад мух хворыя не знаходзяць ратунку. Хворыя ляжаць на брудных пасьцелі, на якой поўзаюць вошы і інш.

Амбуляторыя абслугоўваецца недастаткова кваліфікаванымі работнікамі, а часамі і людзьмі, якія зусім ня маюць мэдычнай асьветы. Напрыклад, **Васілеўскі**, які выконвае абавязкі сястры, прымае хворых, а муж акушэркі часта падмяняе жонку — акушэрку ў той час, калі апошні ніякіх адносін да акушэрства ня мае.

Асабліва дрэнна з доглядам за хворымі. За час прабываньня ў больніцы яны не карыстаюцца ваннай, у той час, калі яна ёсьць. Перад апэрацыямі хворыя, як правіла, ня мыюцца, а ў тыфозным аддзяленьні трымаюцца ў сваіх звычайных прычосках.

Загадчык больніцы д-р **Эпштэйн** ніякіх мер да зьнішчэньня недахопаў ня прымае, а наадварот, сам робіць злачынствы. Наглядаюцца факты пратэкцыянізму з боку Эпштэйна і магчыма, што гэты агідны пратэкцыянізм Эпштэйна паслужыў прычынай сьмерці рожаніцы **Іваноўскай**, якую ён перамясьціў з пакою, у якім была нармальная тэмпэратура, у халодны пакой, бо на яе месца ён палажыў жонку загадчыка сямігодкі Марозаву. І ў гэтым халодным пакоі Іваноўская і нарадзіла і памёрла.

У вогуле за апошні час памёрла 5 жанчын ад родаў. І гэта зусім зразумела, бо яны валяюцца на брудных пасьцелях і ў сваіх хатніх сарочках.

Цікава тое, што на частку памёршых у выніку апэрацыі адсутнічаюць гісторыі хваробы, а калі гісторыі хваробы і ёсьць, дык у іх адсутнічаюць адзнакі аб зробленых апэрацыях. Гэта дае повад думаць, што значная віна ў вялікай сьмяротнасьці падае на хірурга Эпштэйна. Напрыклад, сялянка **Вашук М.** была дастаўлена ў больніцу з дыягназам «рак простай кішкі». Д-р Эпштэйн зрабіў ёй апэрацыю. Вашук па другі дзень пасьля апэрацыі памёрла. Гісторыя хваробы Вашук ня знойдзена. І такіх фактаў, згодна паведамленьня камісіі, ёсьць дастатковая колькасьць.

Усе гэтыя факты ў дастатковай меры характарызуюць становішча больніцы. РВК і мясцовыя арганізацыі аб гэтых фактах ведаюць, але ніякіх мер да гэтага часу да зьнішчэньня недахопаў ня прынята.

Такім агідным адносінам да справы аховы здароўя трэба палажыць канец. Мы патрабуем ад органаў аховы здароўя аднавіць склад мэдпэрсаналу Лепельскай больніцы і вінаватых ва ўсіх гэтых учынках прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Ус. Л—іч.

Канцэрт С. Любімава

Сёньня ў клюбе харчавікоў адбудзецца канцэрт Маскоўскага сьпявака — барытона **С. Любімава** і піяністкі-віртуоза **Аронавай.**

Любімаў — малады сьпявак, сын рабочага такара з г. Крэмянчуга, нядаўна скончыў Маскоўскую кансэрваторыю па клясе праф. Гандольфі. Ён ужо даў рад канцэртаў у гарадох СССР і меў вялікі посьпех у рабочай аўдыторыі. Любімаў выканае каватыну «Фігаро» з оперы «Сэвільскі Цырульнік», куплеты «Тарэадора», пралёг з оперы «Паяцы» і г. д.

Піяністка Аронава — прадстаўніца таленавітага музыкальнага маладняку. У сваіх выступленьнях яна выявіла значны мастацкі тэмпэрамэнт і вялікія віртуозныя даныя.

СПЛАЎ ПАД ПАГРОЗАЙ

Пушчана у сплаў толькі 68 проц. вывезенага лесу

Сплаў лесаматар'ялаў і дроў па рэках Беларусі ўсё яшчэ праходзіць нездавальняюча. Заданьне на сплаве ня выкананa. На 10-га чэрвеня пушчана ў сплаў 1.520 тысяч куб. мэтраў лесаматар'ялаў або 68 проц. і дроў 168.000 куб. мэтраў, або 10,56 проц. заданьня. Прыбыла да канчатковых пунктаў 25 проц. колькасьці вывезеных лесаматар'ялаў.

Органы Наркампрацы ўсё яшчэ не забясьпечылі сплаву рабсілай. Не хапае 7.000 рабочых.

Каапэрацыя не падрыхтавалася да абслугоўваньня плытагонаў, асабліва па лініі арганізацыі грамадзкага харчаваньня. У раёнах прыстаней, у Полацкім і Барысаўскім раёнах дагэтуль не адкрыты яшчэ сталоўкі. Замест работы каапэрацыйныя арганізацыі займаюцца «очковтирательством». Каапэрацыя даўно ўжо наведамляла, што гэтыя сталоўкі адкрыты. З Барысаўскага раёну наведамляюць аб нерабоях у завосе прадуктаў для плытагонаў.

Саюзная работа на сплаве настаўлена слаба. Няма канкрэтных вынікаў сапэнаборніцтва і ўдарніцтва, не разгорнута культурна - масавая работа.

Некалькі слоў аб рабоце Дзяржпараходства. Апошняе ня выконвае ўзятых на сябе абавязкаў па перавозцы драўніны. Плян перавозкі выкананы толькі на 30 проц.

Прэзыдыум Беларускага Камітэту саюзу с.-г. рабочых вызначыў рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні тэмпаў сплаву. У мэтах рацыяналізацыі сплаўных работ на радзе рэк устанаўляецца хранамэтражны нагляд за асноўнымі сплаўнымі работамі. На мясцох будуць вылучаны рабочыя брыгады для праверкі выкананьня дзяржпараходствам пляну перавозак. Член прэзыдыуму саюзу с.-г. рабочых і прадстаўнік Лесбелу камандыруецца ў Полацкі раён для ўзмацненьня сплаву экспартнага лесу.

Прэзыдыум Беларускага камітэту саюзу с.-г. рабочых давёў да ведама ЦСПСБ аб тым, што саюзы дрэваапрацоўшчыкаў і мэдсанпрацы нічога не зрабілі для выкананьня сваіх абавязкаў па абслугоўваньні плытагонаў.

МЕСЯЧНІК ПА ВЫВАЗЦЫ КАМЕНЬНЯ

З 17-га чэрвеня па Меншчыне праводзіцца месячнік па вывазцы каменьня і пяску для дарожнага будаўніцтва. Мен. АВК прапанаваў Цухавіцкаму, Чэрвеньскаму, Сьмілавіцкаму і Вярэйскаму райвыканкомам правесьці растлумачальную кампанію аб задачах месячніка.

МЕНСК

НОВЫЯ ТЭХНІКУМЫ

У гэтым годзе ў БССР адкрываецца 7 новых індустрыяльных тэхнікумаў, у якіх будзе прынята звыш 4.000 чалавек. Тэрмін навучаньня ад 2 да 3 год.

ДАВЕДКІ ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ У ВНУ

НКА пастанавіў арганізаваць у Менску і пры акруговых інспэкцыях асьветы бюро даведак для паступаючых у ВНУ. Такія бюро будуць таксама арганізаваны пры дамох селяніна, на буйных прадпрыемствах, хатах-чытальнях і г. д.

УСЕБЕЛАРУСКІЯ БІБЛІЯТЭЧНЫЯ КУРСЫ

18 чэрвеня ў Менску адкрыліся ўсебеларускія курсы па перападрыхтоўцы бібліятэчных работнікаў, на якія прынята 40 чалавек. Тэрмін навучаньня—1 месяц.

КУРСЫ ЧЫРВОНЫХ ДЫРЭКТАРОЎ

1 ліпеня ў Менску адкрываюцца першыя ўсебеларускія курсы чырвоных дырэктароў, арганізаваныя ВСНГ БССР. На курсы будзе прынята 100 чалавек. Тэрмін навучаньня — 1 год.

ЛЕТНІ ТЭАТРАЛЬНЫ СЭЗОН У МЕНСКУ

ЦП саюзу працмастацтва разам з Пасрэдрабісам выпрацавала плян правядзеньня летняга тэатральнага сэзону ў Менску. З 20-га чэрвеня па 1-га жніўня адбудуцца гастролі Ленінградзкага тэатру ТРАМ. З 1-га жніўня да 7-га жніўня — канцэртныя групы, з 7-га жніўня — музыкальная камэдыя пад кіраўніцтвам Мірасва; з 7-га-ж жніўня —гастролі лётэйскага ТРАМ. Апрача таго, у канцы чэрвеня у Менск прыяжджае маскоўскі дзяржаўны цырк.

ГАСТРОЛІ БЕЛАРУСКАГА ТРАМ'у

Беларускі ТРАМ абслужыў ужо гарады Горкі, Воршу і Барысаў. З Барысава ТРАМ пераяжджае ў Гомель, дзе будзе працаваць да 2 ліпеня. У Менск тэатр рабочай моладзі вярнецца і кастрычніка.

Лістаносец-шкодніца

За апошні час менская паштовая кантора начала атрымліваць скаргі на някаратную дастаўку лістоў. Асабліва дрэнна дастаўляліся лісты на Рэспубліканскай і Нова-Маскоўскай вуліцах. Пошта перадала гэту справу крымвышуку.

Пры вобыску на кватэры лістаносца Ермаловіч, якая разносіла пошту па Н.-Маскоўскай вуліцы, было знойдзена звыш 200 лістоў, як прыватных, так і дзяржаўных устаноў. Сьледзтвам ўстаноўлена, што Ермаловіч наўмысьля не разносіла лісты па адрасох. Некалькі сот лістоў ёю былі зьнішчаны. Крымвышукам Ермаловіч затрымана і перададзена суду.

ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ У АХОВЕ ПРАЦЫ

Тэхніка бясьпечнасьці—па-за ўвагай гаспадарчых арганізацый

Яшчэ ў студзені інспэкцыі аховы працы заключылі дагавары з гаспадарчымі органамі на палепшэньне аховы працы, на выдаткаваньне пэўных сродкаў на тэхніку бясьпечнасьці.

Як выконваюцца гэтыя дагавары? Трэба сказаць, што паводле атрыманых вестак, гаспадарчыя арганізацыі вельмі дрэнна выконваюць іх. Адпушчаныя сродкі не скарыстоўваюцца. Мала ўвагі зварачаецца на тэхніку бясьпечнасьці і г. д. На паняроваі фабрыцы «Гэрой Працы» 2.500 руб., якія павінны былі быць выданы на тэхніку бясьпечнасьці, не скарыстаны. Таксама не скарыстаны 2.500 руб., асыгнаваныя на правядзеньне вэнтыляцыі. На фабрыцы «Спартак» на тэхніку бясьпечнасьці асыгнавана 1.000 руб., але і гэтыя грошы ня выданы.

На **заводзе «Дрэваапрацоўшчык»**, з прычыны невыкананьня дырэктыў аб ахове працы, навялічыліся за апошнія месяцы няшчасныя выпадкі. Цыркуляркі зусім ня маюць агароджы, каля фрэзэрных варштатаў сьлізкая падлога і рабочы вельмі лёгка можа папасьці пад пілу. На Менскай абутковай фабрыцы аднэй работніцы адцісьнула тры пальцы фармованай машынай.

На **гарбарні «Бальшавік»** з-за няспраўнасьці варштату пацярпелі два рабочыя.

Асабліва дрэнна пастаўлена ахова працы **на будаўнічых работах.** Амаль кідзе няма гатаванай вады, не хапае падушак і тапчаноў у інтэрнатах, у бараках вялікая скучанасьць; у Гомелі грабары сьпяць разам з коньмі, і сярод іх зьявілася кароста.

Мэддапамога на будаўніцтвах зусім не наладжана. У многіх мясцох няма аптэчак і камэнтчыкі калі параняць сабе пальцы, прымушаны закручваць руку ў брудныя анучы.

200 рабочых пабудоў ваенведу ў Менску зусім не абслугоўваюцца мэддапамогай — у мэдпункце няма мэдыкамэнтаў, рабочыя прымушаны ісьці ў амбуляторыю за 4 кілёмэтры.

Грамадзкае харчаваньне на будаўнічых работах не наладжана. Шмат дзе няма сталовак і рабочыя прымушаны есьці сухія харчы.

Становішча аховы працы патрабуе карэннага палепшэньня. Яно заслугоўвае ўвагі нашай грамадзкасьці.

Ня спыняючыся перад самымі рашучымі мерамі, трэба дабіцца пераломy ў ахове працы.

А. М.

Спыніць прасьледваньне ўдарніцы Міньковы

Мы ўжо шмат раз пісалі аб дрэнным становішчы з працдысцыплінай у нашых рабочых сталоўках. Палепшэньне працдысцыпліны мае вельмі важнае значэньне ў справе паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Аб тым, як адносяцца ў нашых сталоўках да тых сумленных работніц, якія змагаюцца за працдысцыпліну, сьведчаць наступныя факты.

У 3 сталоўцы МЦРК працуе кваліфікаваная работніца Міньковa. Яна дужой хварэе за непарадкі ў вытворчасьці, яна першая ўдарніца сталоўкі, яна заўсёды рэагуе на нездаровыя зьявішчы на прадпрыемстве.

Тав. Міньковy пачалі прасьледаваць.

Аднойчы ў сталоўцы быў пансаваны кацёл з крупнікам. Міньковa патрабавала расьсьледваньня гэтай справы. І вось усе тыя, хто зацікаўлен у цкаваньні ўдарніцы, распусьцілі чуткі, бы Міньковa наўмысьля ўліла вода ў крупнік. Другі раз Міньковa зьвярнула ўвагу на тое, што вараная рыба расолена і што яе нельга есьці. І яна заявіла аб гэтым на агульным дзе работнікаў сталоўкі, старшыня творчай камісіі імкнуўся яе зьнішчыць. Дайшло да таго, што 2 рабоніцы падалі заяву на Міньковy, быццам яна выдае камусьці прадукты з кухні. Мясцком, не разглядаючы доўга справы, настанаўляе вывесіць прозьвішча Міньковай на чорную дошку.

Мясцком і вытворчая камісія ня чынам ня толькі не рэагуюць на нармальныя зьявішчы, але патурае прасьледваньню сумленнай работніцы-ўдарніцы. Саюз нарахарч павінен зацікавіцца гэтай справай.

ФУК

Паведамленьні

СЁНЬНЯ

БДУ. У аўд. № 18 (прыродазнаўчы корпус) адбудзецца агульна - вытворчая нарада фак. нар. гас. на пытаньн.: праграмы вытворчай практыкі, вылучэньне студэнтаў на навуковую работу. Запрашаюцца студэнты, навуковы працаўнікі і кіраўнікі практыкі. Пач. а 7 гадз. веч.

БДУ. У аўд. 41 (стары будынак) адбудзецца адкрыты партсход яч. КП(б)Б саўбуд і права з парадкам дня: абмеркаваньне тэзісаў тав. Куйбышава да XVI партзьезду і аб выкананьні пяцігадовага пляну прамысловасьці. (Дакл. тав. Канаплін). Пач. а 8 гадз.

Ад Кастрычн. РК КП(б)Б

Дакладчыкамі па пытаньні рабочага забесьпячэньня па Кастрыч. раёне выступаюцца наступныя т. т., якія прымацоўваюцца да наступных вытворчых парткалектываў і ячэек: Сьмірноў, Флеер, Бягун, Гутман (Калгасцэнтр) — да парткалек. з-ду «Бальшавік»; Мінькоў, Аграноўскі, Красоўскі і Новікаў (Калгасцэнтр) — да парткалект. чытункі; Вішнеўскі, Пыжыкаў (Залапаляводсаюз) — да абутковай фабрыкі; Казак, Лібман, Казьлючыц (Малочсаюз), Гурвіч (ЦКК РСІ) — да парткалектыву заводу «Энэргія»; Плаўнік, Румапаў (з-д «Бальшавік») — да шпотачнай фабрыкі; Хэйлін — да яч. бойні; Хікін — да заводу «Чырвоная Зарка»; Гінзбург (БКС) — да яч. грузчыкоў; Брыскін (БСПС) — да сьпіртазаводу; Бартковіч (БСПС) — да хэмфармзаводу; Бацьвінік (БСПС), Стацюк (НКЮ) — да гуты; Міхайлаў (НКЮ) — да каўбаснай фабрыкі; Мар'ясоў (НКЮ) — да лямпавай фабрыкі; Ф... кольскі (НКЮ) — да шчацінпай фабрыкі; Февралёў (НКЮ) — да 2-й бойні; Дзяржгандальбеду; Юрашкевіч (НКЮ) — да фабрыкі «Адраджэньне»; Бурбіс (ЦК КП(б)Б) — да з-ду «Чырв. Хэмік»; Кац (МЦРК) — да абутк. майстэрняў; Альпяровіч (МЦРК) — да малочн. воду; Зялючонак (МЦРК) — да палімер і вагі; Крэйдэль (МЦРК) — ... БСІКА; Канаплін (БДУ) — да ... імя Крупскай; Раготнэр (БДУ) — ... аб'яднан. прафтэхшколы.

Кансультацыя для вылучаных дакладчыкаў адбудзецца ў Доме Асьветы 22 чэрвеня роўна а 7 гадз. веч. (пакой № 19).

Яўка гэтых т. т. на кансультацыю абавязкова. Савецкія і навучальныя ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў самастойна, якія павінны зьявіцца на кансультацыю ў абавязковым парадку.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Калектыў супрацоўнікаў газэты «Беларуская Вёсна» з глыбокім жалем паведамляе аб дачаснай сьмерці супрацоўніка нашай газэты

тав. ГРУШЭЎСКАГА Язэпа

і выказвае спачуваньне сям'і пакойнага.

Пахаваньне заўтра а 4 гадзіне на Старажэўскіх магілках.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага перасоўнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Сёньня, 21 чэрвеня „Жидовка“
Білеты ў касе тэатру і раб. касе. ПАЧАТАК А 9 ГАДЗ. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура“ — Вясёлая камэдыя ў 6 частках **Жыцьцё зусім на ўвесь ход** ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-палітасьвет фільм ў 2 ч. **МАЛАНКА** Пач. 1-га сэансу роўна а 8 г., 2-га—10 г. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Нямецкі фільм вытворчасьці „Уфа-фільм“ **„ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК“** У галоўных ролях: **Рыта Роберто, Фрыц Кампэрс, Віллі форст.** Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз. Каса ад 5 г.

КІНО САД (Савецкая, 71) — ПАДВОЙНАЯ ВЫДАТНАЯ ПРАГРАМА 2 фільмы ў адзін сэанс **ВАРОТЫ КАУКАЗУ** ў 6 част. **ГАРОЛЬД ЛОЙД** у лепшай камэд. **Дзеля прыгожых вачэй** у 3 част. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 9 ГАДЗ. Каса адчынена ад 6 гадз. увеч.

КІНО Пралетары — Замежны мастацкі фільм **ДРУГІ ШЛЮБ** кіно-драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса адкрыта з 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“ — Падвойная праграма. 2 фільмы ў адзін сэанс **ГІГАНТ** 5 частках **СЕНЬКА АФРЫКАНЕЦ** у 2 частках Пачатак 1-га сэансу а 2 гадзіне. Каса адчынена з 12 гадз. дня.

Кіно „СПАРТАК“. Звыш праграмы гастролі артыстых сатыры ТВОРЦАВА І ВЛАДАВА. НА ЭКРАНЕ **ПАТ І ПАТАШОН** у кцаріне **ВЫДАТНЫЯ ПАДАРОЖНІКІ** камэдыя ў 7 частках. УВАГА: Сёньня 4 сэансы. ПАЧАТАК і с.—7 г., 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—10 г., 4 с.—11 г. 30 м. КАСА—ад 6 гадз.

НАРКАМЗЕМ БССР тэрмінова ЗАПРАШАЕ СПРАКТЫКАВАНАГА **ІНЖЫНЭРА-БУДАЎНІКА** для плянава-кантрольнай работы. ПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. Прапановы накіроўваць: Менск, НИЗБ, Савецкая, 71, Сэктар Індустрыялізацыі.

Завод „Беларусь“ зьвяртае ўвагу ўсіх сваіх кліентаў НА НЕАБХОДНАСЬЦЬ дасканалага прагляду марак на тару пры іх прыёме. На апошніх АБАВЯЗКОВА павінна быць трохкутная пячатка бухальтэрыі заводу, № маркі і подпісы дырэктара МОЎЧАНА і бухгальтара —ПІЛЬГРАМ

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакументу

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

Да 10 гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў

ДРУКУЮЦЦА І ХУТКА ВЫЙДУЦЬ

РОДЗЕВІЧ.—**Вогнішча барацьбы.** Мастацкія творы пра жыцьцё і барацьбу рабочых і працоўнага сялянства ў Зах. Беларусі.
БАРАШКА.—**11 ліпеня.** Гістарычны нарыс.
В. СТАШЭЎСКІ.—**Рытмы перамогі.** Зборнік мастацкіх твораў пра белапольскую акупацыю.
В. СТАШЭЎСКІ.—**Чырвоны сьцяг.** Нарысы пра сацбудаўніцтва ў БССР.
СЬЦЕПАНЮК.—**У паход за граматнасьць, за культуру, за новы быт.**
А. СТАШЭЎСКІ.—**Праблемы аўтодору БССР.**
СТРАКОЎСКІ. — **Шляхі электрыфікацыі БССР** (Асінбуд),
ЗВОНАК. — **Каршун** (поэма).
БРОЎКА. — **Прамова фактамі** (поэма).
А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.—**Устаноўка** (зборнік вершаў).
А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.—**Поэма імя Вызваленьня.**
З. БЯДУЛЯ.—**Дзесяць.**
З. БЯДУЛЯ.—**Тры пальцы.**
ЛЯСНЫ.—**Пра дні мінулыя** (успаміны партызана).
ЛЬВОЎСКІ. —**Пад ботам легіёнаў Доўбар-Мусьніцкага.**
Я. ПУШЧА, —**Крывавы плякат** (пра барацьбу з белапалякамі).
КЛЯШТОРНЫ.—**Палі загаманілі** (поэма).
ЛУЖАНІН.—**Неаплачаны рахунак** (расстрэл 14 слуцкіх партызан).
ГОЛЬДБЕРГ.—**На рыштаваньнях** (нарысы пра сацспаборніцтва ў БССР).

21-VI а 7 гадзіне веч. у садзе шкловаводу «Пралетары» адбудзецца **СХОД ЖЫХАРОЎ ЖАКТ'у № 19.**
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вывады брыгад аб працы ЖАКТ'у.
2. Выбары праўленьня і рэўкамісіі.
3. Розное.
Яўка ўсіх членаў ЖАКТ'у абавязкова.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗВЕМАДАЧАЛЬНАГА
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў, тэл. 12
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. веч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях: на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нервовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа.
Кансультацыя прафэсароў на ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурствы дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ звяжыце па тэл. **2-49**

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяжце па тэл. **7-81**

ХАРЬКОВСКИЙ окружной исполнительный комитет рабоче-крестьянских и красноармейских депутатов, харьковский городской совет рабочих и красноармейских депутатов и комитет содействия строительству
ОБ'ЯВЛЯЮТ
ОТКРЫТЫЙ МЕЖДУНАРОДНЫЙ КОНКУРС
на составление проекта государственного театра массового музыкального зрелищного действа на 4.000 мест в г. Харькове.
ЗА ОТНОСИТЕЛЬНО ЛУЧШИЕ ПРОЕКТЫ БУДЕТ ВЫДАНО 12 ПРЕМИЙ

1-я премия	—10.000	5-я премия	— 4.000
2-я »	— 8.000	6-я »	— 3.000
3-я »	— 6.000	7, 8 и 9-я	—по 2.000
4-я »	— 5.000	10, 11 и 12	—по 1.500

Срок подачи проектов 30-го декабря 1930 г.
Программу можно получить с 30 июня с. г. в
г. **Харькове**—в Управлении Харьковского Окружного Инженера—ул. К. Либкнехта № 7.
» В архитектурной секции клуба работников народного хозяйства.
» В обществе Современных Архитекторов Украины (ОСАУ).
г. **Одессе** — в Строительном Институте—улица 10-летия Красной армии № 8.
» в Одесском Архитектурном Обществе—Пушкинская ул. № 9.
г. **Киеве** — в Киевском Художественном Институте—улица Спирнова № 2.
» в Управлении Киевского Окружного Инженера улица Воровского № 25.
г. **Днепропетровске**—в Управлении Окружного Инженера
г. **Москве**—в Московском Архитектурном Обществе—Ермолаевск. пер. № 17.
г. **Москве**—в Обществе Современных Архитекторов (ОСА)—ул. Кропоткина.
г. **Ленинграде**—в Ленинградском Обществе Архитекторов-Художников—Университетская набережн. № 17.
г. **Ленинграде**—в Ленинградском Академическом Архитектурном Обществе—Мойка № 83.
г. **Тифлисе**—в Строительно-Техническом Комитете—Дворец.
г. **Ростове н-Д.**—в Управлении Строительного Контроля.
г. **Новосибирске**—в Краевом Управлении Строительного—Контроля—Красный Проспект, Городской корпус.
г. **Минске** — в Управлении Строительного Контроля.
г. **Елку** — в Окружном Управлении Строительного Контроля—Коммунистическая ул. № 4, здание Бакин. Окрисполкома комн. № 71.
г. **Зиновьевске**—в Строительном Комитете.
Заграницей: в местах и организациях по указанию Украинского общества культсвязи с заграницей.
По всем вопросам, касающимся настоящего международного конкурса обращаться в Управление Окружного Инженера—г. **Харьков**, ул. К. Либкнехта № 7, к ответственному секретарю конкурса Архитектору—**А. ЛИНЕЦКОМУ.**



ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ У МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПОЛІТЭХНІКУМ

Заявы аб паступленьні ў Менскі Дзяржаўны Політэхнікум прымаюцца з 1-га па 25 ліпеня. **Заявы падаюцца на імя Прыймовай Камісіі Політэхнікуму Да заявы далучаюцца наступныя дакументы:**

а) дакумант аб узросьце (мэтрыка),
б) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын),
в) дакумант аб асьвеце,
г) 2 фатаграфічныя карткі,
д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага,
е) дакумант, які сьведчыць аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі,
ж) даведка, засьведчаная нізавой Савецкай арганізацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў,
з) для сялян аклады ліст, альбо засьведчаная копія з яго на сельска-гаспадарчаму падатку на 1929-30 г., а для саматужнікаў аднаведны дакумант аб падатку на 1929-30 г.
і) анкета, засьведчаная прафэсыйнымі, або савецкімі арганізацыямі.

УВАГА: 1. Ніякія копіі дакумантаў ня прымаюцца за выключэньнем дакуманту аб адносінах да вайсковай павіннасьці.
УВАГА: 2. У заяве, альбо анкеце неабходна паказаць на якім аддзяленьні і спэцыяльнасьці паступаючы жадае вучыцца.
УВАГА: 3. Да заявы неабходна прыкладаць паштовыя маркі на 25 кап. для адказу падаўцу заяў.

Узрост паступаючага ў Політэхнікум павінен быць ня ніжэй поўных 15-ці год на 1-е жніўня 1930 г. і ня вышэй 25-ці (могуць быць выключэньня ў адносінах да прыёму па узросту вышэй 25 год).

Асобы, якія скончылі, незалежна ад году сканчэньня, поўны курс 9-ці гадовай працоўнай школы, школы 2-й ступені, 2-х гадовых агульна-адукацыйных курсаў, 7-мі гадовай працоўнай школы, школы дарослых навышэйшага тыпу, школы сялянскай моладзі, прафшколы і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы, зарэгістраваныя органамі НКА, роўна як вытрымаўшыя іспыты ў 1928-1929 і 1929-30 г. пры паступленьні ў політэхнікум аслабаняюцца ад усякіх іспытаў; асобы, якія ня скончылі вышэй пералічаных навучальных установ, павінны трымаць іспыты за курс 7-мі годкі.

УВАГА: скончышыя прафшколы прымаюцца пры наяўнасьці 3-гадовага вытворчага стажу пасьля сканчэньня школы.

Тэрмін іспытаў і залічэньня ўстанаўліваецца з 1-га па 10-е жніўня. З 10—15 жніўня аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы, якія падалі заявы аб прыёме ў Політэхнікум.

УВАГА: Асобы, аслабаняемыя ад іспытаў, зусім не прыяжджаюць і атрымоўваюць пісьмовае паведамленьне аб сваім залічэньні не пазьней 1-га верасьня.

Пры Менскім Дзяржаўным Політэхнікуме існуюць 5 аддзяленьняў:
1) Архітэктурна-будаўнічае са спэцыяльнасьцямі:
а) фабрычна-заводзкага будаўніцтва, б) жыльлёвага будаўніцтва, в) сельска-гаспадарчага будаўніцтва, г) санітарнай тэхнікі.
2) Дарожнае, па пабудове бязрэйкавых шляхоў і мастоў.
3) Гідратэхнічнае-мэліярацыя і асушэньне.
4) Хэмічнае са спэцыяльнасьцямі:
а) па харчавой прамысловасьці, б) скуранай прамысловасьці, в) будаўнічых матар'ялах, г) сухой перагонны дрэва, д) шкляной прамысловасьці і е) гчняровай прамысловасьці.
5) Тарфяное са спэцыяльнасьцямі:
а) на здабываньні і сельска-гаспадарчым скарыстаньні торфу б) на прамысловай пераапрацоўцы торфу.

Курс Політэхнікуму разьлічан на 3 гады.

Політэхнікум рыхтуе—тэхнікаў вытворчасьці па азначаных спэцыяльнасьцях.

Залічаныя на стыпэндыю атрымліваюць права на атрыманьне інтэрнату, ці кватэрных грошай.

Дырэктар Політэхнікуму **Анодзін.**

Менск, Галоўлітбел № 337. Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.